Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).
ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі № 478. Рэдактара—№ 789.
Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к.; на 3 м. — 2 р. 70 к.; на 6 м. — 4 р. — к.; на 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародніх — 20 к., мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 60 к. За радок нанпарэлі сярод тэксту 1 р. — к. За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. даражэй. Зьмена тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент — 25 кап. За кожны дадатковы — 15 к. Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумент — 15 к. За кожны дадатковы — 5 к. Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 285 (2473) Серада, 12-га сьнежня 1928 г.

Гадавіна кантонскае Камуны.

„Праўда" ў перадавіцы пад загалоўкам—«Гадавіна савецкага Кантону» —піша:

Паўстаньне, якое здарылася год назад у Кантоне, зьяўляецца падзеяй усясьветна гістарычнага значэньня. Яно было найвышэйшым пунктам разьвіцьця каляніяльнае рэвалюцыі, якога гэтая рэвалюцыя, накіраваная проці імпэрыялізму, здолела дасягнуць калі-небудзь і дзе-небудзь да сучаснага моманту.

Савецкі Кантон 1927 году быў выявіцелем таго этапу нацыянальнае рэвалюцыі, калі кітайская буржуазея ўжо беспаваротна здрадзіла (і прадала) рэвалюцыю чужаземным імпэрыялістам, калі яна сьпешна ішла да падпісаньня простае зьдзелкі з імі і з бацькаўскімі фэадаламі за кошт рабочых і сялянскіх мас. Рухаючымі сіламі рэвалюцыі засталіся пралетарыят і сялянства як пераважная маса непралетарскага працоўнага жыхарства Кітаю. Ажыцьцяўленьне с а ц ы я л і з м у яшчэ не стаяла на парадку дню, бо на чарзе было выгнаньне чужаземных імпэрыялістаў з Кітаю, рэвалюцыйная ломка аграрных дачыненьняў. Кантонскае паўстаньне паказальна тым, што ў ходзе (яго (таксама, як і ў ходзе тагочаснага рэвалюцыйнага сялянскага руху ў суседніх з Кантонам правінцыях) са стыхійнаю няўхільнасьцю выраслі савецкія формы арганізацыі сіл рэвалюцыі, саветы рабочых і сялянскіх дэпутатаў. Гэтым яшчэ і яшчэ раз гістарычна было даведзена, што ўведзеная ў СССР форма дзяржаўнага панаваньня працоўных мас не выпадковая, што яна ў вышэйшай меры адпавядае інтарэсам разьвіцьця і перамогі масавае рабоча-сялянскае рэвалюцыі.

Мы ня можам назваць рэвалюцыйную кантонскую ўладу сацыялістычнаю дыктатураю пралетарыяту, не, гэта была ўласьцівая для Кітаю рэвалюцыйна-дэмакратычная дыктатура пралетарыяту і сялянства. Але тым вось зьяўляецца і жыцьцяздольнаю савецкая форма рэвалюцыйнае ўлады, што яна, у выпадку далейшых перамог рэвалюцыі, лёгка стварае магчымасьць для перастварэньня рэвалюцыі з нацыянальна-дэмакратычнае ў сацыялістычную.

Кантонскае паўстаньне было сапраўдным паўстаньнем працоўных мас, выступленьне імена іх авангарду,—у гэтым таксама тая яго рыса, якая робіць гэтае паўстаньне самаю буйнаю падзеяй у гісторыі кітайскае і ўсіх каляніяльных рэвалюцый. Камуністычная партыя Кітаю,—вось хто кіраваў паўстаўшымі масамі, вось хто нязьменна пераносіў з імі ўсе цяжары падрыхтоўкі і правядзеньня паўстаньня, перанёс і ўвесь цяжар паражэньня, прыняўшы на сябе ўсе ўдары рэакцыі, якія абваліліся на рабочых і сялян.

Прычыны паражэньня кантонскага паўстаньня ў асноўным былі выкліканы тым, што сілы кітайскае рэвалюцыі былі ў значнай меры паслаблены і патрачаны на папярэдніх этапах барацьбы проці двудушша і здрад кітайскае буржуазеі. Мелі месца таксама і памылкі кіраўніцтва паўстаньнем з боку камуністаў, якія не зьвярнулі патрэбнае ўвагі на больш масавую падрыхтоўку паўстаньня, на больш моцнае заўладаньне масамі ў ходзе паўстаньня. Але паражэньне не адбярэ ад паўстаўшых іх гэраізму, іх выслуг перад кітайскай рэвалюцыяй, якая з кантонскага паўстаньня нязьменна будзе чэрпаць захапленьне і гэраічную энэргію для барацьбы за вызваленьне прыгнечаных народаў і працоўных усіх краёў ад імпэрыялістычнага ярма.

Пад знакам вернасьці ленінскім запаветам.

Пачалася праца 8-га зьезду прафсаюзаў.

МАСКВА. 10-га сьнежня ўвечары ў Вялікім Тэатры адчыніўся 8-мы усесаюзны зьезд прафсаюзаў.

На зьезд прыехала 1035 дэлегатаў з правам рашаючага голасу і 400 з правам дарадчага. НА ЗЬЕЗЬДЗЕ ПРАДСТАЎЛЕНА 11.060.000 АРГАНІЗАВАНЫХ СЯБРОЎ ПРАФСАЮЗАЎ.

Бліжэй да мас, разам з масамі, на чале мас

Уступнае слова т. Томскага.

Тав. Томскі, адчыняючы зьезд, спыніўся на асноўных этапах разьвіцьця нашае гаспадаркі за апошнія 2 гады—між 7-м і 8-м усесаюзнымі зьездамі прафсаюзаў. «Гэты пэрыяд,—зазначыў Томскі,—праходзіў у асаблівых варунках цяжкае і пераможнае барацьбы за сацыялістычную індустрыялізацыю, за ўмовах інтэнсыўнага капітальнага будаўніцтва, пабудовы новых фабрык і электрастанцый, разьвіцьця чыгуначнае сеткі і шырокае перабудовы сельскае гаспадаркі.

Кожны рух каляса,—кажа далей т. Томскі,—кожны ўдар молату, кожны посьпех на гаспадарчым фронце савецкага краю ў выніку дае непасрэднае палепшаньне эканамічнага дабрабыту і культурнага ўзроўню шырокіх мас працоўных.

Поруч з дасягнутымі посьпехамі, зазначае т. Томскі, савецкі пралетарыят прызнае і цяжкасьці, якія стаяць перад ім. Галоўная цяжкасьць, якая выплывае непасрэдна з факту існаваньня СССР у капіталістычным абкружэньні—у ваеннай небясьпецы. Па меры таго, як растуць сацыялістычныя посьпехі рабочае клясы, павялічваецца і ваенная небясьпека з боку клясавых ворагаў рабочае клясы. Каб перамагчы цяжкасьці, нам даводзіцца звярчаць выключную ўвагу на будаўніцтва цяжкае індустрыі, бо варункі прымушаюць нас як мага хутчэй вызваліцца ад чужаземнае залежнасьці. Выканаць гэтую ўмову можна толькі тады, калі шырокія масы рабочае клясы будуць згуртаваны, калі савецкі пралетарыят суцэльна з беднацкімі і серадняцкімі гушчамі сялянства згрупуецца навакол савецкае ўлады і камуністычнае партыі.

УЦСПС выказвае ўпэўненасьць, кажа ўрэшце т. Томскі,—што гэты зьезд выканае стары ленінскі лёзунг: „ПРАФСАЮЗЫ, БЛІЖЭЙ ДА МАС, РАЗАМ З МАСАМІ, НА ЧАЛЕ МАС".

Прэзыдыум зьезду.

У склад рабочага прэзыдыуму зьезд выбірае 90 чалавек. Сярод іх т. т. Томскі, Дагадаў, Л. І. Гінзбург, Яўрэінаў, Лявоўскі, Андрэеў, В. В. Шмідт, Угланаў, Лепсэ, Мельнічанскі, Міхайлаў і інш. У склад ганаровага прэзыдыуму абіраюцца т. т. Сталін, Бухарын, Рыкаў, Варашылаў, Калінін, Куйбышаў, Рудзутак, Молатаў, Арджанікідзэ і Крупская. Абраньне ў прэзыдыум т. т. Сталіна, Рыкава, Варашылава і іншых выклікае доўгія воплескі зьезду.

Пасьля гэтага зацьвярджаецца парадак дню зьезду. Далей зьезд заслухаў прывітаньні т. Рыкава ад ЦК УсеКП(б) і ўраду і т. Варашылава ад Чырвонай арміі. Апроч таго, выступалі з прывітаньнямі і ад Камінтэрну, Прафінтэрну, кітайскае фэдэрацыі прафсаюзаў і ЦК УсеЛКСМ.

ПАВЕТРАНЫЯ УЗБРОЕНЬНІ ФРАНЦЫІ.

МЕНШАВІКІ ЦАЛКАМ ПАДТРЫМАЛІ БЮДЖЭТ МІНІСТЭРСТВА АВІЯЦЫІ

ПАРЫЖ, 10-ХІІ. У часе спрэчак у палаце дэпутатаў аб бюджэце міністэрства авіяцыі з вялікаю прамоваю выступіў камуністычны дэпутат Дорыё. Пасьля Дорыё выступіў дэпутат Рэйно (правая «группа дэмакратычнага дзеяньня»), які, зьвярнуўшыся да дакладчыка па каштарысе міністэрства авіяцыі, сацыяліста Рэнодэля, запытаў: «Ці будуць сацыялісты галасаваць за бюджэт міністэрства авіяцыі, які прадугледжвае каля 800 мільёнаў франкаў на паветраную абарону, ці яны пойдуць проці Рэнодэля?» Рэнодэль, адказваючы на запытаньне, заявіў: „Усё, што мае дачыненьне да разьвіцьця вытворчасьці ў краі і да нацыянальнае абароны, зусім не індыфэрэнтна для сацыялістаў. Калі прызнаваць прынцып узброенае нацыі, дык трэба згадзіцца, што нельга даваць краю драўляныя шаблі ці самалёты з размалёванага картону."

Пры галасаваньні бюджэту міністэрства авіяцыі сакрэтныя фонды міністэрства былі зацьверджаны. Прапанова аб скарачэньні выдаткаў на вайсковае абсталяваньне самалётаў адхілена.

ПАЧАЛАСЯ СЭСІЯ ЛІГІ НАЦЫЙ.

ЛУГАНО, 10-12. Сэсія рады Лігі Нацый адчынілася 10-га сьнежня пад старшынствам Брыяна.

* * *

У парыскіх дыплёматычных сфэрах прыпушчаюць, што нарады Лігі Нацый, якія адбываюцца цяпер у Лугано, дадуць добрыя вынікі. Газэты зазначаюць, што нямецкая тэза аб эвакуацыі Надрэніі ня можа быць прынята Францыяй, аднак маюць надзею, што Брыян і Штрэзэман дойдуць да паразуменьня.

Вайна між Балівіяй і Парагваем.

НЬЮ-ЁРК, 10-ХІІ. У выніку ваенных сутычак у прыгранічнай вобласьці між Балівіяй і Парагваем спынены дыплёматычныя дачыненьні. У Балівіі адбыліся дэманстрацыі з патрабаваньнямі вайны проці Парагваю.

Падставаю для канфлікту між Балівіяй і Парагваем зьяўляецца горная вобласьць Барэаль, якая па велічыні не саступае тэрыторыі Парагваю і багата нафтавымі крыніцамі.

Новы кітайскі мытны тарыф.

ШАНХАЙ, 8-ХІІ. Нанкінскі ўрад зацьвердзіў новыя стаўкі мытнага тарыфу, якія набудуць моц з 1 лютага. Водлуг вестак кітайскага друку, пра новы тарыф паведамлена консулам у Шанхаі, якія павінны давесьці да ведама аб гэтым дыплёматычны корпус у Пекіне. Газэта «Сінь-Вэнь-Бао» паведамляе, што японскае консульства адмовілася прыняць ноту аб новым тарыфе.

4-я СЭСІЯ ЦВК СССР.

Міжнароднае становішча Савецкага Саюзу.

Факт усталяваньня нармальных і нават прыяцельскіх адносін СССР з шмат якімі капіталістычнымі і поўкапіталістычнымі дзяржавамі сьведчыць, што няма ніякіх аб'ектыўных перашкод заснаваць такія-ж адносіны і з рэштаю краёў.

КАПІТАЛІСТЫЧНЫЯ ЎРАДЫ СЬВЯДОМА СТВАРАЮЦЬ ШТУЧНЫЯ ПЕРАШКОДЫ, КАБ СПРАВАКАВАЦЬ УЗБРОЕНЫ НАПАД НА НЕНАВІСНУЮ ІМ ПРАЛЕТАРСКУЮ РЭСПУБЛІКУ.

Пакуль нашыя шчырыя прапановы аб разброеньні адхіляюцца, Чырвоная армія павінна быць гатоваю ва ўсякі момант бараніць Савецкі Саюз.

Даклад т. Літвінава.

МАСКВА, 10-ХІІ. Вячэрняе пасяджэньне 4-е сэсіі ЦВК 10-га сьнежня было цалкам прысьвечана дакладу тав. Літвінава аб міжнародным становішчы СССР. Цікавасьць да дакладу надзвычайная. Загадзя да пачатку пасяджэньня ў Андрэеўскай залі ўсе месцы заняты дэлегатамі сэсіі. Заняты таксама ўсе месцы для публікі.

На пасяджэньні амаль у поўным складзе прысутнічае дыплёматычны корпус. Лёжы чужаземных карэспандэнтаў і савецкае прэсы перапоўнены. Тав. Літвінава члены сэсіі сустракаюць доўгімі і гучнымі воплескамі. Прамова яго выслухоўваецца пры напружанай увазе ўсяе залі. Яна часта перарываецца воплескамі і выгукамі з месц.

У пачатку свайго дакладу тав. Літвінаў спыняецца на найбольш буйных момантах у міжнародным жыцьці апошняга часу.

Буржуазныя ўрады зрываюць мір.

Заняты цалкам унутраным будаўніцтвам,—гаворыць т. Літвінаў—савецкі ўрад у адпаведнасьці з дырэктывамі вышэйшых органаў савецкае ўлады вымушан цьвёрда сачыць за падзеямі, цалкам уяўляючы сабе, што парушэньне міру на любым вучастку зямнае кулі можа прывесьці да ўсеагульнае вайны і што калі нават СССР ня будзе правакацыйным парадкам уцягнуты ў ваенны канфлікт, дык яго эканоміцы і плянам будаўніцтва можа быць любою вайною ўчынена вялікая шкода. Савецкі ўрад павінен, зразумела, асабліва пільна сачыць за ўдзелам непасрэдных суседзяў Саюзу ў міжнародных камбінацыях і групоўках і за ўсім тым, што можа непасрэдна закрануць яго інтарэсы. Але побач з гэтым савецкі ўрад паказвае канкрэтна на той шлях, які вядзе да найбольшага забясьпечаньня ўсеагульнага міру. Такім шляхам савецкі ўрад лічыў і лічыць неадкладнае поўнае ўсеагульнае разброеньне, ці хоць-бы максымальную забарону ўзброеньняў, як першы этап да поўнага разброеньня.

Гэтыя прынцыпы былі выказаны савецкай дэлегацыяй у падрыхтоўчую камісію аб разброеньні пры Лізе Нацый у двох праектах аб поўным і частковым разброеньні.

Успомніўшы далей лёс гэтых двох праектаў, т. Літвінаў гаворыць: «Мірныя крокі савецкага ўраду, як бачыце, не сустракаюць водгуку з боку іншых дзяржаў. Але неабходна прызнаць, што нашыя мірныя прапановы ставяць імпэрыялістычныя краі ў даволі няпрыемнае становішча. Бо ім прыходзіцца, адхіляючы нашыя прапановы, плаціць некаторую дань анты-ваенным настроям працоўных мас і дробна-буржуазных пацыфістаў. Праверыць нашую шчырасьць немагчыма інакш, як згадзіцца з нашымі прапановамі і калі-б іншыя дзяржавы былі сапраўды ўпэўнены ў нашай няшчырасьці, дык ім для праверкі не трэба было-б зрабіць выгляд, што яны згаджаюцца з нашымі прапановамі. Але яны на гэта не ідуць, разумеючы рызыкоўнасьць такога кроку, бо ў душы яны ведаюць, што мы на разброеньне пойдзем і ад сапраўднае праверкі нашае шчырасьці для іх быў-бы толькі сорам».

Падаўшы далей некалькі фактаў з галіны адносін да СССР польскага і румынскага ўраду, а іменна—бязупынныя нарады між генэральнымі штабамі гэтых двох краёў і жвавыя зносіны іх з вайсковымі коламі Францыі, тав. Літвінаў гаворыць далей: «Уся эўрапейская прэса, ня толькі наша савецкая, зьвярнула ўвагу на частыя падарожжы ў суседнія з намі краі францускага генэрала Лерона. Мне зроблена праз францускага пасла ў Маскве заява аб адсутнасьці ў генэрала Лерона якіх-небудзь афіцыйных місій. Я ня буду пярэчыць проці афіцыйнае заявы францускага ўраду, але факт частых падарожжаў генэрала Лерона на ўсход і паўднёвы ўсход Эўропы бясспрэчны, а нашая грамадзкасьць ня схільна верыць, каб генэралы развозілі пальмавыя галы міру, і таму не непакой зусім зразумелы».

Далей т. Літвінаў гаворыць аб тых перашкодах, якія робіць нашым мірным імкненьням урад Францыі і кансэрватыўны ўрад Англіі.

Нас часта папракаюць — кажа т. Літвінаў,—у стварэньні зданяў няіснуючых антысавецкіх блёкаў, у пераўвялічэньні і разьдзьмухваньні пагражаючых Саюзу небясьпек, у залішняй даверлівасьці да паведамленьняў аб антысавецкіх плянах і падрыхтаваньнях. Зразумела, ня ўсе такія паведамленьні заслугоўваюць аднолькавага давер'я і ўвагі ня ўсе даходзячыя да нас чуткі могуць быць даказана і дакументальна правераны. Але таго, што нам вядома на падставе неадхільных вестак, дакумэнтальных даных і на падставе ўласных прызнаньняў у афіцыйных выступленьнях самых нашых ворагаў зусім даволі, каб выразна ўявіць сабе тыя небясьпекі, якія пагражаюць нам з-за межаў. Некаторыя капіталістычныя краі ня спыняюць лічыць зьнішчэньне адзінае пралетарскае дзяржавы сваім першым абавязкам.

Сувязі СССР з капіталістычным сьветам.

Але побач з такімі краямі, ёсьць іншыя капіталістычныя дзяржавы, якія ўжо даўно пераканаліся, ці паступова пераконваюцца ў магчымасьці і ў выгоднасьці супрацоўніцтва з пралетарскай дзяржавай, не зважаючы на яго сацыяльна-палітычныя асаблівасьці. Найбольш яскравым прыкладам такое дзяржавы зьяўляецца Нямеччына, якая падтрымлівае ў працягу сямі гадоў і ўмацоўвае далей свае дачыненьні з Савецкім Саюзам. З вялікім задавальненьнем мы адзначаем няўхільны шпаркі рост нашае эканамічнае сувязі з Злучанымі Штатамі Амэрыкі. Гэтая дзяржава зьяўляецца мабыць найбольш яскравым выявіцелем агульных інтарэсаў капіталістычнага сьвету, тым ня менш мы павінны па справядлівасьці адзначыць, што ў ліку ўрадаў, якія інтыгуюць проці нашага Саюзу, ураду Злучаных Штатаў мы да гэтага часу не знаходзім. Красамоўней усяго гавораць факты і лічбы, а іменна нязьменны рост экспарту Злучаных Штатаў у СССР, рост выкарыстоўваньня намі тэхнічных сіл Амэрыкі і пунктуальнасьць у выкананьні намі ўзятых на сябе абавязацельстваў. Нельга, зразумела, утойваць, што гэтае эканамічнае супрацоўніцтва ў значнай меры цярпіць ад адсутнасьці пад ім лёгальнае базы, ад адсутнасьці афіцыйных дачыненьняў між урадамі абодвых краёў. Калі мы гаворым аб афіцыйных дачыненьнях, мы маем на ўвазе не адно юрыдычнае прызнаньне. Нас, напрыклад, мала цікавіць чыста адвакацкае дэбатуемае ў Амэрыцы пытаньне, ці азначае падпісаньне намі суцэльна з амэрыканскім урадам міжнароднага пакту—прызнаньне. Аб такога парадку прызнаньні можна было-б гаварыць у першыя гады пасьля Кастрычнікавае рэвалюцыі, але на 12-м годзе свайго існаваньня дзяржава не адчувае больш патрэбы ў вусным індывідуальным прызнаньні. 11 гадоў існаваньня аднаго і таго-ж ураду на чале 140-ка мільённага народу, які займае шостую частку сьвету—ёсьць сам па сабе аб'ектыўна агульнапрызнаны факт. Гутаркі аб прызнаньні савецкага ўраду зьяўляюцца цяпер толькі сьмешнымі.

У ліку станоўчых зьявішчаў нашае замежнае палітыкі нельга не адзначыць заснаваньня самых шчырых дачыненьняў і шчыльнага кантакту з Турцыяй. Прыкладам магчымасьці існаваньня нармальных і вельмі карэктных дачыненьняў, не зважаючы на розьніцу сацыяльна-палітычных сыстэм, зьяўляецца нашая сувязь з Італіяй, якая не дае амаль ніякіх падстаў для ўзаемных скаргаў. Тое-ж самае можна сказаць і аб нашых дачыненьнях з нашым заакіянскім суседам—Японіяй. Нармальна разгорнутыя між абодвымі краямі гандлёвыя і іншыя эканамічныя дачыненьні гавораць аб іх узаемнай выгодзе.

Мы з жалем адзначаем, што Кітай яшчэ далёка ад таго, каб вызваліцца ад варожых яму надворных сіл.

Нанкінскі ўрад, на шкоду інтарэсаў кітайскага народу, усё яшчэ праводзіць палітыку Чжан-Цзо-Ліна таго пэрыяду, калі здарыўся наскок на савецкае паўнамоцнае прадстаўніцтва, які выклікаў разрыў зносін.

Наведаньне нашага краю летась аўганскім падышахам надало вельмі моцны характар нашым і раней прыяцельскім дачыненьням з Аўганістанам. З вялікаю зацікаўленасьцю і прыхільнасьцю сочым мы за прагрэсыўнымі рэформамі, якія праводзяцца ў Аўганістане.

Падпісаньне гандлёвага і іншых згод вызваліла шлях для далейшага разьвіцьця нашых прыяцельскіх дачыненьняў з Пэрсіяй.

Дачыненьні нашы з краямі Блізкага Ўсходу і Турцыяй ніколі яшчэ ня былі такімі моцнымі і прыяцельскімі, як зараз. Ніякіх зьмен ня здарылася ў нашых дачыненьнях з прыбалтыцкімі суседзямі—Латвіяй, Літвою, Эстоніяй і Фінляндыяй, калі ня лічыць падпісаньня гандлёвага ўгавору з Латвіяй, які агульна палепшыў нашыя дачыненьні з гэтаю рэспублікаю. Мы ня можам ня цікавіцца пільна лёсам гэтых суседніх з намі краёў, асабліва ў зьвязку з тым, што яны знаходзяцца на нашых галоўных шляхох на Захад.

Ніякіх значных зьмен няма таксама і ў нашых дачыненьнях з іншымі дзяржавамі, з якімі ў нас усталяваліся нармальныя дачыненьні: з Аўстрыяй, Нарвэгіяй, Даніяй і Грэцыяй.

Правакацыйная мана буржуазнае прэсы.

Факт усталяваньня нармальных і нават прыяцельскіх дачыненьняў з шмат якімі капіталістычнымі і поўкапіталістычнымі дзяржавамі сьведчыць, што не безвадзейны патугі, накіраваныя да далейшага пашырэньня гэтага працэсу. Няма ніякіх аб'ектыўных перашкод, каб заснаваць такія-ж дачыненьні з усімі іншымі дзяржавамі і палепшыць сучасныя адносіны, дзе гэта патрэбна. Ёсьць толькі штучна высоўваемыя перашкоды. Аднэю з такіх ш т у ч н ы х ці сьвядома створаных перашкод зьяўляецца пэрыядычнае паўтарэньне і распаўсюджваньне лягенды пра нашыя цяжкасьці, пра няіснуючыя крызісы, катастрофы, паўстаньні і пра набліжэньне канца савецкае ўлады.

Такая кампанія разгорнута ў шырокіх размерах якраз зараз, калі выкарыстоўваецца нашая самакрытыка, дапушчаная намі ў размерах, пра якія нельга і думаць у якім-небудзь іншым краі, выкарыстоўваюцца нашы ўласныя заўвагі ў прэсе і прамовах на нашыя недахопы, на нашы перашкоды, якіх мы самі ня таім, і на якія не адважваецца ніводзін з капіталістычных краёў. Прызнаныя намі перашкоды замежная буржуазная прэса перакручвае і перабольшвае да нячувана сьмешных размераў. Усе гэтыя махінацыі нашых ворагаў ня прымусяць нас адхіліцца з таго шляху, на які мы ўжо 12-ты год ідзём упэўненым крокам да намечанае мэты.

Вораг упэўніцца ў нашай моцы.

Для нас былі і застаюцца чужымі нам якія-б там ні былі заваёўчыя агрэсыўныя мэты. *Мы праводзім палітыку міру ня ў моц слабасьці сантымэнтальнага пацыфізму, а таму, што гэтая палітыка міру жыве ў самой сутнасьці савецкае ўлады, яна адпавядае інтарэсам нашага будаўніцтва і інтарэсам шырокіх працоўных мас усяго сьвету. Але пакуль нашыя настойлівыя прапановы разброіцца ці часткова скараціць узброеньні адхіляюцца, датуль мы не павінны і ня будзем паслабляць сваё баявое сілы перад узброенымі да зубоў капіталістычнымі краямі, якія ня спыняюць узбройвацца і ўдасканальваць свае ўзброеньні, выкарыстоўваючы сваю высокую індустрыяльную тэхніку.*

Мы ня будзем паслабляць свае баявое сілы, каб—у тым выпадку, калі хто-небудзь уздумае паверыць байкам пра нашую няіснуючую слабасьць ці перашкоды і напасьці на нас,—нашая Чырвоная армія здолела апраўдаць набытую ёю рэпутацыю баявое здольнасьці, *каб гэтая схватка абярнулася сапраўды ў «апошні і рашаючы бой»*. (Гучныя воплескі).

* * *

Тав. Чарнякоў паведамляе пра паданыя ў прэзыдыум пісулькі ад сяброў сэсіі, якія хочуць выказацца па дакладзе Літвінава.

Першым мае слова т. *Ларын*; пасьля яго выступаюць т. т. *Параўка* (УССР), *Эліава* (ЗССР), *Дубіна* (БССР), *Волкаў* (РСФСР), *Ахун-Бабаеў* (Узб.ССР), *Курц* (рэспубліка немцаў Павалжжа).

Быць далей на варце спакою.

Пастанова сэсіі.

Пасьля гэтага слова для прапановы бярэ старшыня СНК УССР т. Чубар. Ён прапануе рэзалюцыю, якая аднагалосна ўхваляецца Саюзным Саветам і Саветам Нацыянальнасьцяй.

«ЦВК СССР, заслухаўшы даклад выконваючага абавязкі Народнага Камісара па Замежных Справах т. М. М. Літвінава аб міжнародных дачыненьнях, ухваляе: 1) цалкам адобрыць палітыку ўраду Саюзу ССР, накіраваную на дасягненьне і ўмацаваньне мірных дачыненьняў Саюзу ССР з усімі дзяржавамі сьвету; 2) адзначаючы, што няўхільна мірнай палітыцы савецкага ўраду, яго сыстэматычным патугам у справе ўсеагульнага і хоць-бы частковага сапраўднага разброеньня перашкаджае адпор з боку моцных капіталістычных дзяржаў—даручыць ураду Саюзу ССР няўхільна праводзіць і ў далейшым палітыку міру і разброеньня і адначасна пільна сачыць за ўсімі спробамі, накіраванымі да парушэньня міру і ўцягваньня чалавецтва ў новую разьню, праводзячы барацьбу за выкрываньне гэтых спроб і за ўмацаваньне мірнага сужыцьця ўсіх народаў».

У Саюзных Рэспубліках.

Перадвыбарчая кампанія на Украіне.

ХАРКАЎ, 11-ХІІ. З Арцёмаўскае акругі паведамляюць, што акруговая выбарчая камісія паўторна адзначыла немагчыма марудны тэмп прадвыбарчае кампаніі ў саветы і слабы ўдзел у ёй прафарганізацый. Сябры сталінскае акруговае выбарчае камісіі, якая вярнулася з падарожжа па раёнах, зазначаюць на слабую падрыхтоўку да перавыбараў саветаў на месцах. Сябры раённых выбарчых камісій у сельскіх выбарчых камісіях амаль што не бываюць, а ўхваленыя на пасяджэньнях раённых і сельскіх выбарчых камісій пастановы не ажыцьцяўляюцца.

У Адэскай акрузе ў перавыбарчай кампаніі шырока ўдзельнічаюць жанчыны. Адбылася канфэрэнцыя шэфскіх таварыстваў, прысьвечаная ўдзелу шэфаў у перавыбарчай кампаніі на вёсцы. У канфэрэнцыі ўзяло ўдзел больш 400 чалавек. Канфэрэнцыя шэфаў намеціла на выходныя дні масавы выезд рабочых на вёску. Рабочыя будуць выяжджаць брыгадамі, якія будуць складзены з рабочых сталяроў, механікаў, а таксама мастакоў, артыстаў і музыкаў. Поруч з агітацыйнаю працаю брыгады будуць рабіць рамонт с.-г. прылад беднаты, калектываў, хат-чытальняў, школьнае мэблі і г. д.

У Крамянчуцкай акрузе саюз с.-г. рабочых правёў 14 раённых канфэрэнцый батрацтва, каб падрыхтаваць яго да перавыбарчае кампаніі. Разам з тым саюз вылучыў 40 актывістаў для правядзеньня працы на перавыбарах саветаў.

У Дняпрапятроўскай акрузе праводзіцца агляд працы камітэтаў сялянскае беднаты. Мэта—прыцягнуць беднату і батрацтва для адпору кулакам у часе перавыбарчае кампаніі.

У Баку (АМССР) ужо праведзена некалькі справаздачных сходаў гарсавету. Сходы адзначаюцца небывалаю жвавасьцю. Здаровая крытыка чулася ад рабочых на гэтых сходах.

Новыя члены прэзыдыуму ВСНГ СССР.

МАСКВА. Склад прэзыдыуму ВСНГ СССР папоўнен Ксандравым і Сухамлінавым.

Малакане згодны служыць у Чырвонай арміі

БАКУ, 11-ХІІ. Азэрбайджанскі зьезд малаканаў, які адбыўся ў Баку, аднагалосна ўхваліў рэзалюцыю абавязкова адбываць вайсковую службу ў Чырвонай арміі, «трымаючы зброю ў руках». Гэтую рэзалюцыю зьезд абгрунтоўвае тым довадам, што «савецкая ўлада ў асобе Літвінава выказала сябе на канфэрэнцыі аб разброеньні самаю працавітаю і мірнаю дзяржаваю. Калі хочаш міру, дык трэба быць гатовым на ўсё. Гэта не супярэчыць сьвяшчэннаму пісаньню. З гэтае прычыны трэба падтрымліваць мерапрыемствы савецкае ўлады да абароны СССР".

Новы калгас-волат.

СТАЎРОПАЛЬ, 11-ХІІ. У вёсцы Старая Мар'еўка заснаўваецца калгас-волат на абшары 25 тысяч гэктараў. Вёска мае 1200 гаспадарак, з якіх 40 проц. ужо калектывізавана. Калектыўная гаспадарка аграмаджвае паляводзтва, цягавую сілу, мёртвы земляробчы інвэнтар і транспартныя сродкі. Калгасу выдаюцца трактары і машыны на мільён рублёў. Да вясны заснаваньне калгасу будзе скончана.

Рост выплаўкі чыгуну.

МАСКВА. На чарговым пасяджэньні пад старшынствам т. Куйбышава пастаяннае планавае нарады ВСНГ СССР былі зроблены некаторыя сапраўкі да новага варыянту кантрольных лічбаў пяцігадовага пляну разьвіцьця прамысловасьці.

Нарада зацьвердзіла ў асноўным наметку попыту і прапановы чорных мэталяў за 5-цігодку. Выпрацоўка чыгуну на гэты пэрыяд узрастае з 4074000 тоны да 5-ці мільёнаў тон пры росьце попыту з 4265000 тон да 5343000 тон. Такім парадкам, патрэба ў чыгуне, дзякуючы паступоваму росту вытворчасьці, будзе задаволена да канца 5-цігодкі амаль што поўнасьцю.

ШЫРОКІЯ ЗАДАЧЫ ПЕРАД УСЕСАЮЗНАЙ АКАДЭМІЯЙ НАВУК.

ЛЕНІНГРАД, 10-ХІІ. Зараз-жа пасьля выбараў новых акадэмікаў у Акадэміі Навук адбудуцца выбары прадугледжаных новым статутам Акадэміі 2-х віцэ-прэзыдэнтаў.

Якіх-жа кандыдатаў можа шматлікі склад сапраўдных сяброў рэфармаванае Акадэміі Навук высунуць у віцэ-прэзыдэнты? На гэтае запытаньне кіраўнік справаў СНК СССР тав. Н. Т. Гарбуноў, які прыехаў учора ў Ленінград, у гутарцы з нашым супрацоўнікам зазначыў: „Згодна статуту, Акадэмія сама абірае наважкага кандыдата, а СНК толькі зацьвярджае выбары. Згодна статуту, ёсьць дзьве пасады віцэ-прэзыдэнтаў, прычым меркавалася, што адзін віцэ-прэзыдэнт будзе выконваць значную частку ўнутраных прац у Акадэміі, а другі—павінен будзе клапаціцца аб стварэньні для Акадэміі такіх умоў працы, пры якіх яна з найбольшымі вынікамі магла-б ажыцьцявіць шырокія задачы, пастаўленыя перад ёю ў раздзеле «в» § 2 статуту, дзе зазначана: «Прыстасоўваць навуковыя тэорыі і вынікі навуковых вопытаў і досьледаў да практычнага ўжываньня ў прамысловасьці і культурна-эканамічным будаўніцтве Саюзу ССР». У выбарах павінны ўзяць самы чынны ўдзел новыя акадэмікі, вылучаныя на гэтыя пасады шырокаю грамадзкасьцю. Не выпадковым з гэтае прычыны зьяўляецца тое, што выбары і зацьвярджаньне віцэ-прэзыдэнтаў былі адкладзены да абраньня новых акадэмікаў. Можна думаць, што выбары новых акадэмікаў будуць скончаны ў студзені.

Павялічан бяспроцантны выпуск 2-е пазыкі індустрыялізацыі.

МАСКВА. Першыя вынікі разьмяшчэньня аблігацый другое пазыкі індустрыялізацыі сярод жыхарства паказалі, што попыт на бяспроцантныя аблігацыі павялічыўся. У зьвязку з гэтым саюзны СНК ухваліў перараэмеркаваць суму пазыкі ў 500 мільёнаў руб. між яго выпускамі, устанавіўшы размер процантна-выйгрышнага выпуску ў 200 мільёнаў і бяспроцантна-выйгрышнага—ў 300 мільёнаў. Процантна-выйгрышны выпуск падзяляецца на чатыры бяспроцантна-выйгрышныя разрады па 50 мільёнаў рублёў. Кожны разрад у свой чарод падзяляецца на 80.000 сэрый па 25 аблігацый на суму 625 рублёў у кожнай сэрыі.

Супярэчнасьці між Італіяй і Францыяй узмацняюцца.

На тэй глухой барацьбе, якая ўжо ў працягу шмат гадоў вядзецца паміж дзьвюма «лацінскімі сёстрамі»—Францыяй і Італіяй,—барацьбе, якая момантамі дасягае такога высокага напружаньня, што абодвы бакі пачынаюць сьцягваць да сваіх межаў войскі, можна ясна бачыць, у якіх вялізарных унутраных супярэчнасьцях жыве і змагаецца капіталістычны сьвет.

Італьянскі імпэрыялізм, які марыць аб гегемоніі над усёй Эўропай, вельмі коса паглядае на сваю ўзброеную да зубоў суседку—Францыю, з якой у яго ёсьць шмат сур'ёзных прычын для разгалосьсяў. Тут і пытаньне аб Ніцы і Савоі, тут і канкурэнцыя ў пытаньні ўладаньня над Міжземным морам, якое пакуль што амаль цалкам знаходзіцца ў руках францускага ваеннага і гандлёвага флёту, на што вайздросным вокам паглядае малады фашысцкі імпэрыялізм, тут і надзвычайна вострае пытаньне аб панаваньні над Тунісам, які ў сучасны момант знаходзіцца пад прафэктаратам Францыі і г. д.

Асабліва гэтае апошняе пытаньне не дае супакою італьянскаму імпэрыялізму. Італія - краіна ў прамысловых адносінах не вельмі багатая. З другога боку, вялізарны прырост насельніцтва прыводзіць да таго, што не маючы магчымасьці знайсьці працу ў сябе на бацькаўшчыне і ахвяраваныя на беспрацоўе, масы італьянскіх рабочых эмігруюць у іншыя краіны—у суседнюю Францыю, у Туніс і іншыя паўночна-афрыканскія калёніі, у Злучаныя Штаты і ў рэспублікі Паўднёвай Амэрыкі. Зразумела, што гэта непадабаецца італьянскім капіталістам, якія з вялікай прыемнасьцю самі хацелі-б эксплёатаваць гэтую вялізарную масу італьянскіх перасяленцаў. А дзеля гэтага ім патрэбны калёніі.

Уступаючы ў імпэрыялістычную вайну на баку саюзьнікаў, Італія спадзявалася, у выпадку перамогі над цэнтральнымі імпэрыямі, пашырыць свае калёніяльныя ўладаньні. Але і тут яе чакала вялікае расчараваньне. У часе падзелу здабычы большая частка былых калёніяльных уладаньняў Нямеччыны перайшла да Англіі і Францыі. Італіі-ж прыйшлося задаволіцца толькі рэшткамі са стала галоўных імпэрыялістычных драпежнікаў. І вось пакрыўджаная гэтым Італія не абмінае ніводнага выпадку, каб напомніць аб парушэньні яе «правоў» на калёніі і аб несправядлівасьці, учыненай у адносінах да яе ў Вэрсалі. І галоўным вінаватцам у гэтым яна лічыць Францыю, якая вельмі ўзбагацілася калёніямі пасьля імпэрыялістычнай вайны.

Надзвычайна непакоіць фашысцкую Італію і ангельска-французская згода. Гэтая згода пагражае Італіі ня толькі па лініі яе калёніяльнай палітыкі, але яна пагражае яе гегемоніі і на Балканах, да якой ужо ў працягу шэрагу гадоў імкнецца Мусаліні. Італьянскі імпэрыялізм усімі сіламі імкнуўся і імкнецца замацаваць сваё панаваньне на Балканах. У гэтай гульні на Балканах, якая ўжо вядзецца даўно, пагражае небясьпека з боку ўсё тэй-жа Францыі, якая рашуча заявіла свае прэтэнзіі на гегемонію і на кіраўніцтва палітыкай усіх Балканскіх дзяржаў.

У апошнія дні франка-італьянскія ўзаемаадносіны ізноў завастрыліся. Пуанкарэ ў адной з сваіх прамоў у францускай палаце дэпутатаў між іншым сказаў аб «дзяржаве з імпэрыялістычнымі тэндэнцыямі, якая гатова пераняць у Францыі мандат на Сірыю і не карыстаецца сымпатыямі францускіх левых партый». Гэтыя словы выклікалі шмат абурэньняў па той бок альпійскіх гор. Італьянская прэса ў гэтыя дні выказала шмат няпрыемнай праўды сваей суседцы—францускай прэсе. Выказаны былі думкі і аб рэальным францускім імпэрыялізьме; не забыты былі і ўказаньні на зьверствы францускага імпэрыялізму ў Сірыі і Марока і іншых калёніях.

А лёгкі, па думцы італьянскіх фашыстаў, прысуд парыскага суду па справе італьянскага супроць-фашысцкага эмігранта Мадуньё, забіўшага італьянскага віцэ-консула ў Парыжы (Мадуньё прысуджан на 2 гады астрожнага зьняволеньня) яшчэ больш завастрыў і без таго ўжо надзвычайна напружаныя адносіны паміж Францыяй і Італіяй.

Беліна-Падгаецкі.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Зьезд польскае ваеншчыны.

ВАРШАВА. 10-12. Зьезд легіянэрскіх арганізацый скончыўся. У цэрамоніі адчыненьня зьезду ўзяў удзел прэзыдэнт Масьціцкі і жонка Пілсудзкага. Сам Пілсудзкі на зьездзе ня прысутнічаў і ад яго імя ўдзельнічаў генэрал Сьміглы. Зьезд адбываўся пры зачыненых дзьвярах. Бліжэйшы супрацоўнік Пілсудзкага палкоўнік Славэк даводзіў на зьездзе ў сваёй прамове патрэбу пераглядзець канстытуцыю.

Зьезд ухваліў рэзалюцыю, якая падкрэсьлівае, што легіянэры, стоячы на грунце ажыцьцяўленьня плянаў Пілсудзкага «у сэнсе наданьня польскай дзяржаве магчымасьці самага шырокага вялікадзяржаўнага разьвіцьця», выказваюць поўную ўхвалу парляманцкае дзейнасьці Славэка. Рэзалюцыя заяўляе, што абвінавачаньне легіянэраў у фашызьме ня мае падстаў, бо легіянэры зьяўляюцца прыхільнікамі „творчае дэмакратыі".

Старшынёю саюзу легіянэраў абраны Славэк.

Пагроза забастоўкай.

Працаўнікі варшаўскіх гарадзкіх магазынаў не атрымалі аднаразовай дапамогі ў разьмеры 45 проц. пэнсіі, тады як гарадзкія служачыя іншых катэгорый вышэйпамянёную дапамогу атрымалі. Цяпер служачыя магазынаў пагражаюць забастоўкай у выпадку незадаволеньня іх вымаганьняў.

Скралі 40.000 злотых.

Гэтымі днямі ў кантору фабрыкі штучнага шоўку ў Мышкаве (пад Варшавай) уламаліся зладзеі і скралі ў касе 40000 злотых, прыгатаваных у канвэртах для выплаты работнікам. Зладзеі ня злоўлены.

Чыгуначная катастрофа.

Уначы 4 на 5 лістапада таварны поезд, які ішоў па чыгуначнай лініі Лазы—Варшава наехаў на рабочы поезд, з прычыны чаго цягнік і 13 вагонаў разьбіліся. Кіраўнік поезду забіты і два служачыя паранены.

Замах на карэспандэнта „Ілюстр. Кур. Цодзен".

Бэрлінскі карэспандэнт „Ілюстр. Кур. Цодзен". Т. Гэльлер атрымаў пасылку, падобную на пудэлак кансэрваў, у якім знаходзіўся мэханізм гадзіньніку. Пакліканыя паліцыя і пажарнікі ўстанавілі, што пасылка зьяўляецца пякельнай машынай.

Прысуд над газэтамі.

Апэляцыйны віл. суд разглядаў дзьве справы. адну п. Рэйзіна з „Вільнэр Тогу" адлажыў, а другую—п. Марна Лятура, выдаўца «Экспр. Пораннага», прысуджанага 1-ай інстанцыяй, апэляцыйны суд пакінуў бяз зьмены і прыгавар 1-й інстанцыі на 3 мес. турмы і 1000 зл. штрафу пакінуў у сіле.

Рост дарагоўлі.

Паводле афіцыйнай статыстыкі ўзрост дарагоўлі ў Польшчы ў лістападзе г. г. дасягнуў 1,6 проц.

ЛЕЙД-ДЖОРДЖАВА ПРАГРАМА „РАЗБРОЕНЬНЯ"

ПЕРАДВЫБАРНЫ ТРУК АНГЕЛЬСКІХ ЛІБЭРАЛАЎ.

ЛЁНДАН, 10-12. Агенцтва Райтэра паведамляе, што лідэры лібэральнае партыі зьясьцілі агалошаную лібэральнай партыяй праграму міру і разброеньня. Праграма прадугледжвае поўную адмову ад вайны, як сродку разьвязаньня міжнародных канфліктаў. Далей лібэралы патрабуюць неадкладна падпісаць угавор, які абавязаў-бы Англію перадаваць у міжнародны трыбунал усе міжнародныя канфлікты юрыдычнага характару і ўжываць арбітраж для мірнага вырашэньня ўсіх іншых канфліктаў. У праграме прадугледжана адмова ад ідэі спаборніцтва з Паўночна-Амэрыканскімі Злучанымі Штатамі ў галіне пашырэньня марскога вайсковага флёту

Гастролі Хлестакова з 2-га Інтэрнацыяналу.

ТОКІЁ, 10-12. Адчыніўся зьезд партыі сякай-мін-сюто (народная сацыяльная партыя). Зьезд заслухаў прывітаньне Альбэра Тома, які ў сучасны момант знаходзіцца ў Токіё. У сваей прамове Тома заявіў, што вітае зьезд ня ў якасьці дырэктара міжнароднага бюро працы, але як францускі сацыяліст, „які вядзе бязупынную барацьбу за вызваленьне чалавецтва". У гэтай барацьбе Тома, водлуг яго слоў, прытрымліваецца прынцыпу Жорэса—«ідэалізм, які грунтуецца на рэальнасьці».

ВЕСТКІ АДУСУЛЬ

ПРАЎДА ВОЧЫ КОЛЕ.

ЛЁНДАН, 10-12. Большасьць газэт агалошвае паведамленьні з Масквы, што савецкі друк зьвязвае паўстаньне ў Аўганістане з захадамі Англіі. Газэты дадаюць да гэтых паведамленьняў загалоўкі накшталт «Савецкія вачкі» і г. д., устрымліваючыся ад іншых тлумачэньняў.

ЗАГРАНІЧНЫЯ ГАСТРОЛІ СТУДЫІ ІМЯ АЙСЭДОРЫ ДУНКАН.

МАСКВА. 10-га сьнежня ў Амэрыку выехала студыя імя Айсэдоры Дункан у поўным складзе на чале з Ірмаю Дункан. Студыя запрошана для ўдзелу ў «тыдні Дункан», наладжаным нью-ёрскім камітэтам па ўшанаваньні Айсэдоры Дункан. У студзені студыя выяжджае ў 4-хмесячнае турнэ па Амэрыцы і Канадзе. У праграме гастроляў скокі рэвалюцыі: «Варшавянка», „Замучан цяжкаю няволяй", «Дубінушка», „Піянэрскія сьпевы" і інш. Варочаючыся назад, студыя мяркуе наведаць Францыю, Нямеччыну, Італію і Прыбалтыцкія дзяржавы.

Напады шаўлісаў.

„Слово" (№ 283) паведамляе, што адзел літоўскай пагранічнай варты перайшоў польска-літоўскую граніцу ў Сьвянцянскім пав. і зьнішчыў некалькі тэлеграфных і тэлефонных слупоў. У другім месцы шаўлісы, перайшоўшы граніцу, напалі на маёнтак Падгор'е п. Ліпскага і ўкінулі ў сярэдзіну дома бомбу, якая не разарвалася.

СТАЧКА НА ФРАНЦУСКАЙ КАНЦЭСІІ Ў ШАНХАІ.

ШАНХАЙ, 5-XII. Блізка 1.500 рабочых трамваю францускае канцэсіі забаставала, патрабуючы павялічыць заработак, прызнаць саюз і ўзяць на працу звольненых.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

ЗАГАТОЎКІ НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ

(Ліст з Гомелю).

Загатоўкі ільнянога валакна разгортваюцца здавальняюча. Лістападаўскі плян выканан поўнасьцю. Усяго загатавана 212 тон. Спрыяюча адбілася на загатоўцы ільнянага валакна ўраджай лёну сёлета, значнае павялічэньне загатоўчых цэн супроць узроўню леташняга году і пераважная дастаўка прамтавараў, а асабліва мануфактуры, здатчыкамі ільнянога валакна.

Для далейшага забясьпечаньня пасьпяховаг разгортваньня ільняных загатовак, ужыты меры да павялічэньня завозу прамтавараў, забясьпечаньня наступленьня хлеба для дастаўкі ільнаводам. Загатоўка пянькі, у процілегласьць лёнавалакну, праходзіць вельмі нездавальняюча. За ўвесь лістапад загатоўлена ўсяго 37 проц. пляну.

Загатоўкі скураной сыравіны павялічыліся. Папярэднія даныя паказваюць, што лістападаўскі плян загатовак буйнай скуранай сыравіны будзе выканан поўнасьцю, а ў адносіне дробнай сіравіны будзе значнае недавыкананьне пляну. Асноўная прычына слабасьці загатовак дробнае скуранае сыравіны—надзвычайна мізэрная дастаўка вёсцы скураных тавараў. Многія сяляне хаваюць скураную сыравіну для саматужнай перапрацоўкі для ўласных патрэб. У сувязі з гэтым Акргандаль прыняў шэраг мер да ўзмацненьня дастаўкі ў вёску скуртавараў.

Загатоўка бульбы праходзіць здавальняюча. Якасьць была ня зусім здавальняючая. Загатоўка сьвіньняў ідзе вельмі дрэнна, з прычыны значнага разрыву паміж загатоўчымі і рыначнымі цэнамі.

Становішча з дастаўкаю сала досыць вострае. Забясьпечаньне спажыўца салам праходзіць з перабоямі. Перад Наркамгандлем узьнята пытаньне аб выдзяленьні спэцыяльных крэдытаў для стварэньня рэзэрвовага фонду сала. Кантрактацыя бэконных сьвіньняў не атрымала належнага разьвіцьця.

Становішча з кароў'ім маслам застаецца яшчэ вельмі напружаным. Плян вырабу масла на лістапад выканан толькі на палову па лініі Малочсаюзу. Наступленьне масла з іншых акруг па нарадах Наркамгандлю было вельмі нязначнае. Напрыклад, Рэчыцкі ЦРК, замест належачых да паступленьня 70 пуд. масла, атрымаў толькі 6 пуд. Дабрускі ЦРК замест 65 пудоў—10 пуд., Гомельскі замест 168—20 пудоў.

В.

ПАЛЯПШАЕМ ПРАЦУ КРЭДЫТНАЙ КААПЭРАЦЫІ.

(Ліст з Бабруйску).

Работа крэдытнай каапэрацыі за апошнія гады значна пашырылася і палепшылася якасна. Значна пашырылася сетка крэдытных таварыстваў. Гэта пабліжыла апошнія да сялянства, дало магчымасьць лепш яго абслугоўваць.

Баланс крэдытнай сыстэмы Бабруйшчыны за апошні год павялічыўся на сто процантаў, дасягнуўшы 4 з лішнім мілёнаў рублёў. Гэта дало магчымасьць шырока разгарнуць крэдытаваньне сялянства, прычым крэдытаваньне доўгатэрміновае. На пашырэньне апошняга ў прайшоўшым годзе была зьвернута дастатковая ўвага, бо, трэба прызнаць, што доўгатэрміновыя пазыкі дасягаюць значна большай мэты, чым каротка-тэрміновыя.

Апошні год працы даў таксама і стопроцантнае павялічэньне ўкладаў у крэдытнай каапэрацыі нашай акругі. У сучасны момант гэтыя ўклады дасягаюць 260 тысяч руб.

Праўда, гэтую лічбу нельга назваць дастатковаю пры размаху агульнай працы нашай крэдытнай каапэрацыі. Яна яшчэ вельмі мала. І к таму-ж роля яе памяншаецца яшчэ і тым, што ў агульнай лічбе ўкладаў роля чыста сялянскіх укладаў яшчэ вельмі нязначная.

Крэдытная каапэрацыя за апошні год сваей работы выдала звыш 2 мільёнаў крэдытаў, прычым 61 процант гэтых сродкаў выдадзена адзінаасобным сялянскім гаспадаркам, гаспадаркам вясковай беднаты і вясковаму серадняцтву. Гэтыя групы сялянства і складаюць у асноўным склад пайшчыкаў нашых крэдытных таварыстваў.

Характэрнымі зьяўляюцца лічбы росту ліку крэдытных таварыстваў па акрузе. Калі ў 1925 годзе на Бабруйшчыне налічвалася толькі 9 крэдытных таварыстваў, дык на 1 кастрычніка 1928 году іх мелася на акрузе ўжо 41. У сучасны момант кожнае крэдытнае таварыства абслугоўвае тры тысячы сялянскіх двароў. Няма сумненьняў, што з году ў год сетка таварыстваў крэдытных будзе яшчэ болей расьці.

Хваробай крэдытнай работы на акрузе і па гэты час яшчэ зьяўляюцца пратэрміноўкі, якія дасягаюць сотні тысяч рублёў. На мясцох спагнаньне пратэрміновак праходзіць слаба. Непажаданым зьявішчам трэба яшчэ прызнаць і практыкуемае на мясцох нераўмернае дробленьне пазыковых ссуд. Гэта ўбудучым неабходна выжыць.

У астатнім-жа наша крэдытная каапэрацыя здаровая, фінансава моцная. Яна мае ўсе падставы для свайго далейшага разьвіцьця. А. Дамброўскі.

„Чырвоны Крыж" разгортвае працу.

(Ліст з Мазыру).

Нядаўна закончыў сваю працу пашыраны пленум акруговага камітэту «Чырвонага Крыжу», які адзначыў значнае пашырэньне працы «Чырвонага Крыжу» ў вёсцы і ў фабрычных пасёлках. На працягу апошняга году сетка ячэек «Чырвонага Крыжу» вырасла з 57 да 62, а лік сяброў з 1412 чал. да 2528.

Маецца моцны актыў, які налічвае да 500 чалавек.

На акрузе працуе 19 вайскова-санітарных гурткоў, з лікам звыш 400 чал. у іх; маецца 5 гурткоў на заводах.

У Капаткевіцкім раёне арганізавана раённая дружына «Чырвонага Крыжу», куды прымаюцца толькі асобы, маючыя дастатковы вопыт у працы вайскова-санітарных гурткоў.

„Чырвоным Крыжам" праведзена значная санітарная работа ў вёсцы, вядзецца актыўная барацьба са знахарствам.

У Капаткевічах пабудавана і абсталявана лазьня; апошняя цяпер перадаецца райвыканкому. Утрымоўваюцца 3 дзіцячыя кансультацыі, улетку арганізоўваліся яслі, аказвалася падтрыманьне піанэрам у правядзеньні летняй працы ў лягерах. Улетку працавалі атрады „Чырвонага Крыжу" па прышчапліваньню воспы насельніцтву ў Тураўскім і Лельчыцкім раёнах,—самых далёка аддеглых і культурна-адсталых на Мазыршчыне. Зроблена было 15.000 прышчэпак. У вёсцы распаўсюджвалася бясплатна літаратура і чыталіся лекцыі на санітарна-бытавыя тэмы.

Ва ўсіх вёсках Капаткевіцкага і Азярыцкага раёнаў маюцца аптэчкі, якія карыстаюцца вялікім аўтарытэтам сярод сялянства.

Пленум адпусьціў сродкі на пабудову лазьняў у Юравічах і Карповічах, і пабудову студняў у Слабадзе і ў шэрагу вёсак Каралінскага і Лельчыцкага раёнаў.

Распачата арганізацыя зубнога перасовачнага габінэту для абслугоўваньня найбольш глухіх куткоў акругі.

Праца «Чырвонага Крыжу» разгортваецца.

М. Гохфэльд.

Рыхтуюцца да сьвяткаваньня 10-тых угодак БССР.

Гомель, 11-XII. У Новабеліцы заснавана раённая камісія па правядзеньні сьвяткаваньня 10-ці гадовага юбілею абвяшчэньня БССР. На прадпрыёмствах праводзяцца гутаркі аб значэньні 10-цігодзьдзя. 16-га сьнежня будуць агульныя сходы рабочых і служачых, прысьвечаныя 10-цігодзьдзю.

На гэтых сходах будуць даклады аб нацыянальнай палітыцы партыі і савецкае ўлады. 29,30 і 1 студзеня 29 г. будуць наладжаны вечары, прысьвечаныя сьвяткаваньню. 31-га сьнежня ў клюбах фабрыкі «Везувій» і лесазаводу будуць урачыстыя пасяджэньні.

АПА габінэт райкому КП(б)Б паладжвае выстаўку літаратуры. У казармах, школах таксама будуць праведзены вечары, прысьвечаныя сьвяткаваньню. Рэдкалегія выпушчае спэцыяльныя нумары, прысьвечаныя сьвяткаваньню. На фабрыцы «Везувій» заснавана спэцыяльная камісія па правядзеньні сьвяткаваньня.

НА БАРАЦЬБУ З ЗАСЬМЕЧАНАСЬЦЮ ПАСЕВАЎ.

Шпаркае разьвіцьцё нашых калгасаў, сельска-гаспадарчых арцеляў, узмацненьне эканамічнага становішча саўгасаў дае нам магчымасьць у значнай ступені павялічыць той тэмп разьвіцьця сельскае гаспадаркі, які наглядаўся да апошняга часу.

Толькі праз калектывы і арцелі і наогул праз каапэраваную сельскую гаспадарку большая частка насельніцтва зможа ўсьвядоміць тыя элемэнтарныя прыёмы культурнага земляробства, якія забясьпечваюць нам у бліжэйшыя пяць год падвышэньне ўраджайнасьці на 25-30 проц. Да ліку гэтых першапачатковых простых прыёмаў культурнага земляробства належыць: павялічэньне кармоў (канюшына і карэньплоды), мінэральнае ўгнаеньне, пасеў палепшаным сэлекцыйным зярном і палепшаная апрацоўка глебы.

У царскай Расеі магла выкарыстаць гэтыя зусім простыя прыёмы культурнага земляробства толькі больш заможная частка насельніцтва, бо карыстаньне сартыроўкай, добрым плугам, набыцьцё ўгнаеньня, палепшанага сэлекцыйнага насеньня было немагчыма асноўнай масе сялянскіх гаспадарак.

Зараз становішча зусім зьмянілася. Праз калектывы і арцелі і іншыя віды каапэраванае сельскае гаспадаркі прыёмы культурнага земляробства зможа скарыстаць пераважная большасьць сялянскіх гаспадарак і ў выніку ў бліжэйшыя пяць год мы будзем мець такі тэмп разьвіцьця сельскае гаспадаркі, які быў зусім немагчымы ў царскай Расеі і наогул пры капіталістычным ладзе.

Адным з такіх галоўнейшых прыёмаў, галоўнейшых фактараў культурнага земляробства зьяўляецца насеннаводзтва. Вынікі працы нашых дасьледчых установаў і перадавых сялянскіх гаспадарак сьведчаць аб тым, што адна толькі замена сялянскага засьмечанага насеньня, якое перарадзілася і якое нават на добрай глебе дае кепскі ўраджай, насеньнем чыстым, сэлекцыйным, падвышае ўраджайнасьць на 25-30 проц. Гэта добрае насеньне нашаму сялянству павінны даць саўгасы і калгасы. Бязумоўна, яны гэту задачу выконваюць ўжо зараз.

Я хачу спыніцца толькі на адным моманце, які, на мой погляд, вельмі дрэнна адбіваецца на гэтай справе.

Улетку сёлета я працаваў па дасьледаваньні чыстагатунковасьці пасеваў у саўгасах Бабруйскае акругі. І вось я наглядаў выпадкі, калі пасевы добрага гатунковага насеньня былі засьмечаны сьмяцьцёвымі расьлінамі на 30 проц., а засьмечанасьць палёў амаль ва ўсіх саўгасах дасягала 10-15 проц. Зусім ясна, што ў такіх умовах самае лепшае гатунковае насеньне ня зможа даць і палову таго эфэкту, які яно дало-б на чыстай глебе.

Чаму-ж нашы палі так моцна засьмечаны? Амаль кожны год мы сартыруем насеньне, арганізуем зернаачышчальныя абозы, марнуем на гэта шмат грошай і часу, а належных вынікаў ня маем. Трэба сказаць, што значная частка віны ў гэтым прыпадае на нашых кіраўнікоў саўгасаў і калгасаў. Кіраўнік амаль кожнае гаспадаркі перад пасевам сваёй першапачатковай задачай лічыць адсартыроўваць абавязкова насеньне. Ачысьціць насеньне—гэта добра, вельмі добра, але-ж гэта яшчэ ня ўсё. Яшчэ трэба стварыць умовы, каб сьмяцьцёвыя расьліны зьнішчаць і іншым шляхам.

Папершае, трэба пільна сачыць за разьвіцьцём сьмяцьцёвых расьлін на полі пры ворыве, як толькі ўбачым, што сьмяцьцёвыя расьліны змогуць даць усхожае насеньне, зараз жа апрацоўваць папар. Гэта зусім ясная агранамічная ісьціна, а выконваецца далёка не ва ўсіх саўгасах: апрацоўку глебы выключна прыстасоўваюць толькі да моманту пасеву.

Падругое, саўгасскія палі маюць г. зв. межнікі, канавы, на якіх можна сабраць дзесяткі, калі ня больш, самых розьнастайных відаў сьмяцьцёвых расьлін.

Гэтыя сьмяцьцёвыя расьліны спакойна растуць на межніках, сьпеюць і потым абсяваюць побач ляжачую культурную пахату, дзе знаходзяць найлепшыя ўмовы для свайго далейшага разьвіцьця. І, нарэшце, ва ўсіх саўгасах на палёх назіраем такі малюнак, што ўсё поле часам бывае даволі і чыстае, але-ж каля такой канавы межніка заўсёды цягнецца паласа пахаці, вельмі моцна засьмечаная, у параўнаньні з рэштаю поля.

І вось, калі зьвяртаеш увагу кіраўніка на гэта, дык ён часам як бы ўпяршыню гэта бачыць, а часам гаворыць, што часу ня было абкасіць межнік і г. д.

І выходзіць, што мы з аднаго боку рашуча змагаемся з сьмяцьцёвай расьліннасьцю, амаль кожны год сартыруем насеньне, а з другога боку самі-ж культывіруем сьмяцьцёвыя расьліны на сваёй апрацаванай глебе. Гэта зусім ненармальнае зьявішча. Калі мы будзем і далей так рабіць, дык ніколі ня зьнішчым сьмяцьцёвых расьлін.

Трэба, папершае, абавязкова ачышчаць насеньне перад сяўбой; падругое, абавязкова для ўсіх гаспадарак абкошваць межнікі, дарогі, канавы не ў пэрыяд жніва і нават пасьля жніва, як гэта ўсюды цяпер робіцца, а не пазьней мая і ня менш, як два разы на лета, і, патрэцяе, весьці барацьбу за своечасовую апрацоўку глебы, не дапушчаючы, каб сарнякі давалі ўсхожае насеньне, гэта абавязкова для гаспадарак, якія маюць ўдастатку цяглавой сілы.

Толькі тады, калі будзем праводзіць барацьбу ў паказаных вышэй 3-х напрамках, мы ў хуткім часе зьнішчым сьмяцьцёвую расьліннасьць, і такім чынам, павялічым як колькасную, так і якасную прадукцыйнасьць усяе нашае сельскае гаспадаркі.

Таўкачоў Ал.

Падрыхтоўка не вядзецца.

(Ляды, Аршанскай акругі).

Зараз у нашай Ляднянскай сямігадовай школе распачалася падрыхтоўка да сьвяткаваньня 10-й гадавіны існаваньня БССР. На пасяджэньні культкамісіі выпрацавалі плян падрыхтоўкі да 10-й гадавіны існаваньня БССР: пастанавілі наладзіць вечар, на якім зрабіць даклад прысьвечаны 10-й гадавіне існаваньня БССР; паставіць п'есу з часоў вызваленьня Беларусі ад белапалякаў і некаторыя інсцэніроўкі; арганізаваць хор з беларускіх сьпеваў і скокаў, якія ўжываюцца ў вёсках.

Выпусьціць два нумары насьценнай газэты, прычым адзін нумар газэты з краязнаўчым характарам пад назвай «Куток Ляднянашчыны». Па меры магчымасьці вучні сумесна з настаўнікамі мяркуюць выпускаць рукапісную краязнаўчую часопісь.

Адбіць жыцьцё Ляднянашчыны да 10 год у дыяграмах, для чаго трэба зрабіць выстаўку.

Кепска тое, што райкомам партыі яшчэ ня выпрацаван плян сьвяткаваньня 10-й гадавіны БССР на Ляднянашчыне. Пакуль што ніякай падрыхтоўкі да сьвяткаваньня не вядзецца і ня дадзены ўказаньні іншым арганізацыям.

Я думаю, што райкому партыі трэба распачаць падрыхтоўчую працу да сьвяткаваньня 10-е гадавіны існаваньня БССР пакуль яшчэ ня позна.

В. Цэлікаў.

Сьвіней закантрактавалі мала.

Ворша, 5-XII. Кантрактацыя сьвіней для будуючагася бэконнага заводу па ўсёй акрузе ідзе занадта слаба. Замест патрэбнай колькасьці 2400 штук сьвіней—закантрактавана ўсяго 150.

Сельска-гаспадарчая каапэрацыя і Белдзяржгандаль амаль нічога не зрабілі па кантрактацыі.

СЯЛЯНЕ КУПЛЯЮЦЬ ПАЗЫКУ.

(Ляднянскі р-н, Аршанскай акр.).

Па разьмеркаваньні акругі на Ляднянскі раён прыпала 2-й пазыкі індустрыялізацыі 11.000 руб. Але дзякуючы стараннай працы арганізацыі раёну, пазыкі было распаўсюджана больш заданьня на 315 руб. Гэта значыць 11.315 руб., што складае 103,1 проц.

Пазыку купляе значная частка сялян.

Я. С. Кручкоў.

РАЦЫЯНАЛІЗУЕМ ПРАЦУ САВЕЦКІХ УСТАНОЎ.

Гомель, 11-XII. РСІ праводзіць вялікую працу па рацыяналізацыі савецкага апарату.

У кожнай установе выдзяляецца супрацоўнік адказны за працу па рацыяналізацыі. Для кіраваньня гэтай працай пры РСІ ўтвараецца бюро па рацыяналізацыі.

КАРЫСТАНЬНЕ ШТУЧНЫМ УГНАЕНЬНЕМ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА.

Гомель, 11-XII. Палессельсаюз робіць закупку да будучай вясеньняй пасяўной кампаніі мінэральных угнаеньняў, якіх будзе значна больш, чымся ў мінулым годзе. Супэрфасфату мяркуецца ўвезьці 900 тон, томасшлаку—300 тон, касьцяной мукі—100 тон і г. д.

ПРАЦА ЯЧЭЕК „АЎТАДОРУ" ПАЛЕПШЫЛАСЯ.

Гомель, 11-XII. Бязьдзейнічаючыя раней ячэйкі «Аўтадору» зараз значна ажыўляюць сваю працу. Лік членаў з кожным днём узрастае. Пасьпяхова праходзіць продаж лётарэйных білетаў. Пачынаецца кампанія падпіскі на часопісь „За рулем".

У бліжэйшы час у Новабеліцы будуць адчынены аўтамабільна-трактарныя курсы на 50-60 чалавек. У розных раёнах акругі адчыняюцца для сялян курсы па шляхаваму будаўніцтву.

За шырокую агульную і спэцыяльную самаадукацыю!

Удзельная вага агульнай і спэцыяльнай самаадукацыі набывае асабліва важнае значэньне у час, калі гаспадарчыя задачы — разьвіцьцё прамысловасьці і перабудова вёскі—пастаўлены канкрэтна; гэта работа набудзе яшчэ большы тэмп, калі шырокія рабоча-сялянскія масы будуць разумець вытворчыя працэсы ў разьвіцьці нашай сацыялістычнай гаспадаркі, калі яны самі будуць прымаць актыўны ўдзел у гэтай грандыёзнай перабудове гаспадаркі, якая распачалася і праходзіць на абшарах нашага Саюзу. А бяз шырокага распаўсюджваньня агульных і асабліва спэцыяльных ведаў (агранамічных, тэхнічных) сярод непасрэдных удзельнікаў сацыялістычнага будаўніцтва—рабочых і сялян— немагчыма вырашэньне гэтай задачы. Вытворчыя нарады на фабрыцы, уздым вытворчасьці, якасьць прадукцыі, рацыяналізацыя самой вытворчасьці, уздым ураджайнасьці сельскай гаспадаркі—усе гэтыя моманты патрабуюць ад усіх культурных сіл напружанай працы на доўгі час.

Для прыкладу я прывяду некалькі момантаў, характарызуючых вялікія імкненьні да гэтай асьветы. На Дубровенскай мануфактурнай фабрыцы самі рабочыя на сходзе вынесьлі пастанову аб арганізацыі гуртка па тэкстылю і інш. відах тэхнікі; сяляне ў Расьнянскім раёне з'арганізавалі сельска-гаспадарчы гурток з 30 пажылых сялян і патрабуюць агранома, каб ён з імі займаўся; гэтыя запатрабаваньні асабліва выявіліся яскрава на вечары пытаньняў і адказаў на Дубровенскай фабрыцы. Пасьля гэтага на Дубровенскай фабрыцы брак значна зьменшыўся. Пасьля сельска-гаспадарчых гурткоў у Расьнянскім раёне (Даўгавіцкі с.-с.) сяляне з'арганізавалі машыннае і малочнае т-вы.

Вось некаторыя лічбы па Аршанскай акрузе, якія сьведчаць аб недастатковым тэмпе агульнай і тэхнічнай асьветы (самаадукацыі), хоць апошнія часы гэта работа набывае большы размах:

С.-гаспадарчых гурткоў па акрузе у 1927-28 г. было 31—641 ч., вайсковых 70—941 чал., аграапрацыйных 78—1858 чал., санітарных гурткоў 6—90 чал., палітычных 70—1602 ч., самаадукацыйных 44—2385 чал., лекцый і гутарак прачытана 2357—72610 чал.

На 1928-29 г. па Аршанскай акрузе ёсьць наступная сетка агульнай асьветы:

Пры Сельска-Гаспадарчай Акадэміі ў Горках працуе **нядзельны сялянскі унівэрсытэт**; пры смальлянскай с.-гасп. прафшколе адчыніўся сёлета нядзельны тэхнікум, які ахоплівае 60 сялян; ёсьць два надтэхнікумы на даму для ўзьняцьця кваліфікацыі настаўніцтва; у раёнах налічваецца 2 школы сялянскай моладзі і 5 школ рабочай моладзі. Але ўсё гэта недастаткова.

Для ўзмацненьня гэтай работы неабходна: 1) шырока папулярызаваць пастаноўку агульнай і спэцыяльнай асьветы (праз сходы, насьценгазэты, гутаркі, даклады); 2) пры ўсіх тэхнікумах з'арганізаваць тэхнікумы на даму і ажывіць работу існуючых ужо; 3) С.-Гаспадарчая Акадэмія і сельска-гаспадарчая прафшкола павінны з'арганізаваць нядзельныя сялянскія універсытэты, тэхнікумы, завочныя тэхнікумы; 4) у мясцох, дзе будуюцца электрычныя станцыі, пабудаваць гурткі па электрафікацыі для вакольных працоўных мас; 6) пры ўсіх прафшколах арганізаваць курсы тэхнічнай асьветы для рабочых; 7) па ўсіх фабрыках абавязкова ўтварыць гурткі па вывучэньню працэсаў вытворчасьці на фабрыцы; 8) узмацніць выпуск масавай таннай літаратуры як па галіне агранамічнай, так і асабліва тэхнічнай; 9) палітасьветным установам шырока разгарнуць работу па арганізацыі розных гурткоў навокал гэтых установаў; 10) праводзіць лекцыі і даклады па хатах-чытальнях, клюбах, нардамох, чырвоных кутках, саўгасах, камунах, прыцягваючы да гэтай работы ўсе культурныя сілы.

Я. Кудзелька.

Збор закантрактаваных культур адстае ад тэмпу загатовак.

(Па лініі с.-г. каапэрацыі).

За 2 месяцы загатоўлена на 3670000 руб.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам сябра праўленьня Белсельсаюзу т. Талапіла абмаляваў ход загатовак па лініі сельска-гас. каапэрацыі.

Загатоўкі на працягу кастрычніка-лістапада па лініі с.-г. каапэрацыі паступова павялічваюцца. Так, у кастрычніку сыстэмай с.-г. каапэрацыі загатоўлена розных прадуктаў і сыравіны на 1619000 руб., а ў лістападзе —на 2051000 руб. Такім чынам, за кастрычнік-лістапад загатоўлена розных прадуктаў і сыравіны на 3670000 руб., летась-жа за 3 м-цы было загатоўлена на 3500000 руб. Ёсьць усе падставы меркаваць, што загатоўчы плян за першы квартал бягучага году будзе выкананы поўнасьцю. Пераходзячы да аналізу загатовак па асобных культурах трэба адзначыць, што мы назіраем тут вялікую стракатасьць. Так, па буйнай скураной сыравіне плян за 2 месяцы ў сярэднім выкананы на 143 проц., а па дробнай—на 70 проц. Па шчаціне і конскаму воласу плян выканан на 101,5 проц., а па пушніне толькі на 77 проц.

Плян па загатоўцы сена ў кастрычніку выканан на 166 проц., у лістападзе—на 160, а па хлебу—на 44 і 88 проц.—тут зноў бачым недавыкананьне пляну. Па семя-лёну ў кастрычніку заданьне выканана на 130 проц., а ў лістападзе толькі на 58; па валакну лёну плян за 2 м-цы выкананы ў сярэднім на 71 проц.

Зварачвае на сябе ўвагу недавыкананьне пляну ў загатоўцы хлеба і рэзкае зьніжэньне загатовак семя лёну. Апошняе тлумачыцца недастатковым завозам хлеба ў лёнаводныя раёны.

Працуюць з «прохладцем».

Апрача ўсіх паказаных прычын, на ходзе загатовак, бязумоўна, адбіваецца недастатковае разгортваньне іх па ўсёй сыстэме с.-г. каапэрацыі. Ня ўся нізоўка яшчэ ўцягнута ў загатоўчую працу, у некаторых мясцох ня досыць добра падабраны апарат. Вінавата таксама і загатоўчая праца з «прохладцем». Апрача таго мае і дагэтуль яшчэ месца ажыятаж. Напрыклад, у адным з раёнаў Аршанскай акругі працаўнікі Дзяржгандлю нанялі склад, замкнулі яго пустым і самі ў гэтым месцы не вядуць ніякай загатоўчай працы. Зрабілі-ж гэта толькі для таго, каб ня даць мясцоваму с.-г. т-ву магчымасьці скарыстаць склад, які, да слова сказаць, знаходзіцца побач з т-вам.

Ня лепш і ў самой Воршы: працаўнікі Дзяржгандлю прыбеглі на склад сел.-гас. каапэрацыі і ўчынілі фармальную бойку з працаўнікамі каапэрацыі. Зразумела, такія выпадкі ёсьць ня толькі ў Аршаншчыне, але і па іншых акругах БССР. Такі антаганізм паміж загатоўцамі зьяўляецца ў выніку неразуменьня агульных задач. Гэтае адцягваньне сіл на міжведамсьцьвенную барацьбу паслабляе тэмп загатовак і дэзарганізуе рынак. З гэтымі хворымі зьявішчамі трэба больш рашуча весьці барацьбу.

Збору па кантрактацыі пагражае зрыў.

Калі мы лічым тэмп загатовак яшчэ недастатковым, дык зусім кепска стаіць справа з паступленьнем сыравіны па кантрактацыі. Тут ужо становішча такое, што пагражае ня толькі зрыву збору закантрактаваных культур, але і самой ідэі кантрактацыі. Напрыклад, калі выкананьне першапачатковага пляну па загатоўках семя лёну набліжаецца да 100 проц., дык закантрактаванага сабрана толькі 45 проц. заданьня. Пасеўнага семя лёну сабрана па кантрактацыі толькі 9 проц., валакна лёну—20 проц., ячменю—26 проц., бульбы—28 проц. супроць таго, што трэба было ўжо сабраць.

Трэба адзначыць катастрафічнае становішча са зборам закантрактаванай бульбы ў Віцебшчыне (выканалі 2 проц.), у Полаччыне—15 проц., і Аршаншчыне—19 проц. заданьня. Пры сярэднім выкананьні пляну збору закантрактаванага ячменю ў 26 проц. Віцебшчына сваё заданьне выканала толькі на... 1 проц., Мазыршчына—на 10 проц. Па збору валакна лёну асабліва кепска стаіць справа ў Меншчыне (5 проц. пляну) і Полаччыне 0,5 проц.

Характэрна адзначыць, што па гэтых-жа культурах тэмп звычайных загатовак значна вышэй тэмпу паступленьня па кантрактацыі. Тут мімаволі прыходзіцца зрабіць вывад, што кантрактанты другі раз прадаюць сваю прадукцыю.

У чым-жа прычыны?

Матар'ялы з месц сьведчаць аб тым, што ў пэрыяд вясеньняй кампаніі ня зусім ясна зразумелі значэньне і характар кантрактацыі мясцовыя працаўнікі. Кепска быў падрыхтаваны да кантрактацыі серадняк. Значная частка кантрактацыі праводзілася ў гаспадарках, якія эканамічна не змаглі забясьпечыць здачы закантрактаванай прадукцыі. З боку сельсаветаў і селькомаў узаемадапамогі меліся масавыя выпадкі выдачы паперак аб тым, што гэты гаспадар можа кантрактаваць, што ў яго трэба закантрактаваць.

Слабае наступленьне па кантрактацыі тлумачыцца таксама і тым, што мясцовыя працаўнікі с.-г. каапэрацыі недастаткова выяўляюць ініцыятыву. Матар'ялы з месц сьведчаць аб тым, што там, дзе працаўнікі каапэрацыі пабывалі ў сялян, здача даходзіць да 70 проц. заданьня. (Узаўскае т-ва, Гомельшчына).

У заключэньне трэба адзначыць і тое, што фармальна аднесьліся да гэтай справы і суды. Так, з матар'ялаў відаць, што суды адмаўляюцца прымаць справы на нядатчыкаў да 1 студзеня, кажучы, што тады канчаецца дагавор па кантрактацыі.

Трэба ўжыць максымум энэргіі і ўсе сілы да зьнішчэньня паказаных недахопаў і ўзмацніць тэмп загатовак, а асабліва збор сыравіны па кантрактацыі.

Сваё тарфяное таварыства.

Да 1927 годзе ў м. Баеве (Ляднянскага р-ну, Аршаншчына) было возера, якое стаяла без карысьці, а толькі ім карыстаўся млынар прыватнік.

Але ўжо ў 1928 годзе ў маі месяцы спажывецкае таварыства паклапацілася аб тым, каб арганізаваць тарфяное таварыства. І вось арганізавалі, сяляне ахвотна сталі ўступаць у члены таварыства.

У сёлетнім годзе ўжо спусьцілі і абсушылі возера і ўзяліся за распрацоўку. Працавала кожны дзень па 25-30 чалавек, выпрацавана торфу 78 кубоў. Ленінскім калектывам куплена 15 кубаў і сяляне шмат яго куплялі.

У будучым годзе будуць працаваць машынай. Пайшчыкі, члены таварыства маюць права дармова самі дабываць торф. Сяляне цяпер не клапоцяцца аб дровах.

Н. С. К. (Баеўскі с.-с., Аршаншчына).

НАПЯРЭДАДНІ ПЕРАВЫБАРАЎ САВЕТАЎ.

Новы, шырокі пласт рабочых, батракоў і сялян-беднякоў—у склад саветаў.—Прэч усё гнілое, кулацкае, антысавецкае!—Няхай жывуць клясава вытрыманыя, працаздольныя саветы!

Местачковы савет выканаў наказ выбаршчыкаў.

(М-ка Талочын, Аршанскае акругі).

Падрыхтоўка да перавыбараў у Талачынскім местачковым савеце, Аршанскай акругі праводзіцца жвава. Выбарчая камісія ўжо пачала працаваць. Сёлета, апроч местачковага савету, перад насельніцтвам будуць складаць справаздачы па кожным вучастку некаторыя ўстановы, як амбулаторыя, агранамія і нават пракурор і сьледчы аб сваёй працы.

Праца местсавету перад выбаршчыкамі будзе ілюстравацца ў дыяграмах. Для таго, каб праверыць працу местачковага савету, наколькі выкананы наказ дадзены выбаршчыкамі, быў склікан 18 лістапада пленум, на якім прысутнічалі многія сяляне.

Асабліва вялікая праца, як зазначыў старшыня т. Сьвяцыцкі, праведзена местсаветам у галіне правядзеньня калектывізацыі і пераходу гаспадарак на калектыўныя формы землякарыстаньня. Арганізавана 5 калектываў і 1 камуна ў вучастку Зарэчча—Талачын, у якія ўвайшлі 47 гаспадарак, з іх 16 бядняцкія, а рэшта—серадняцкія. У самым мястэчку арганізавана 4 калектывы, у якія ўвайшлі 28 гаспадарак.

У сёлетнюю вясну распачата праца па землеўпарадкаваньню. Праца гэта будзе закончана к будучаму году.

Вялікая праца праведзена па ўпарадкаваньню мястэчка. Грошы, сабраныя ад самаабкладаньня пайшлі, туды, куды жадала насельніцтва. На шляхавае будаўніцтва патрачана 970 руб., на школу 1700 руб., на бальніцу 1100 руб., на проціпажарныя патрэбы 1100 руб.

Дакладчык зазначыў таксама на шэраг недахопаў у працы местачковага савету. Праца сярод беднаты сыстэматычна не вялася. Камітэт узаемадапамогі, які ў мінулым годзе некаторую працу праводзіў, сёлета спыніў яе зусім. Камісіі пры местачковым савеце: па ўпарадкаваньню, фінансавая, сельска-гаспадарчая і культурна-асьветная працавалі слаба, а галоўнае ня прыцягвалі да сваёй працы ўсю масу. У камісіі па ўпарадкаваньню, апроч старшыні т. Воліна, ніхто з членаў не працаваў.

Выступаўшыя ў спрэчках зазначалі на тое, што санітарная камісія недастаткова наглядала за чыстатой.

Пленум прызнаў працу местачковага савету здавальняючай.

Хаім Зак.

Чакаюць дырэктыў зьверху.

(Ліст з Віцебску).

Перавыбары саветаў сёлета будуць праходзіць пад знакам абвостранай клясавай барацьбы. Усе факты апошніх дзён гавораць аб тым, што наш клясавы вораг—кулак і ўсе інш. антысавецкія элемэнты вёскі—шырока рыхтуюцца да перавыбараў. У гэтых умовах асабліва значэньне набывае пытаньне аб забясьпечаньні пралетарскага кіраўніцтва перавыбарамі.

Віцебская Акрпрафбюро 23 лістапада праводзіла спэцыяльную нараду прадстаўнікоў саюзаў на якой быў распрацаваны канкрэтны плян удзелу прафсаюзных саюзаў у кампаніі па справаздачы і перавыбараў сельсаветаў з тым, каб забясьпечыць у іх склад ня толькі вясковага пралетарыяту але таксама і рабочай клясы гораду, якая зьвязана з вёскай (ф-ка «Дзьвіна», К. Маркса, «Ноўка», Іпатніцкая «Чырвоная Зорка» і інш.).

Гэта было два тыдні таму. Што канкрэтна саюзамі зроблена ў гэтым кірунку?

ЦП тэкстыльшчыкаў яшчэ 16 лістапада ўхваліла на бліжэйшым пленуме абгаварыць ліст ЦСПСБ аб падыходзячых перавыбарах.

Праўда, пленум адбыўся, але ніякага абгаварэньня гэтага пытаньня на пленуме ня было. Адказны сэкратар саюзу т. Васкін нейкую інфармацыю там зрабіў і пленум ухваліў пастанову «садзейнічаць у перавыбарах саветаў». Больш нічога канкрэтнага пленум не сказаў, ЦП у сваю чаргу больш нічога не зрабіла.

Ня ў лепшым стане знаходзіцца гэтая праца ў саюзе працаўнікоў зямлі і лесу, які павінен быў узяцца за арганізацыю ўсяго батрацтва. Тут выявіўся цікавы малюнак бязупыннага чаканьня нейкіх дырэктыў.

— Акругком нам нічога яшчэ не сказаў, Акрвыканком яшчэ не паведаміў, ЦП саюзу дырэктыў не даслала. Значыцца чакаем.

— А ці доўга гэтак будзеце чакаць?

— Як-небудзь яно будзе. Год таму нашы дэпутаты давалі справаздачы сваім выбаршчыкам. Ну і досыць. Надыйдзе час і зноў зробім.

У прафсаюзе чыгуначнікаў ніяк ня могуць дачакацца пакуль «Гудок» загаворыць пра перавыбары.

Без «Гудка» рыхтавацца ня можам. Ну, і чакаюць.

Прыблізна гэткае становішча таксама і ў іншых прафсаюзах. Шкада, што ніводзін з іх ня ўцяміў яшчэ адказнасьці гэтае задачы, якая на іх ускладзена.

Усе «чакаюць», чакаюць і чакаюць...

Ці ня час ужо пачаць і працу.

Макс.

Справаздачная кампанія праходзіць добра.

(Дукорскі с.-с., Сьмілавіцкага раёну, Меншчына).

Справаздачная кампанія распачалася з 1 сьнежня і ўжо праведзены сходы ў трох вучастках. Ёсьць станоўчыя і адмоўныя бакі.

З боку большай часткі прысутнічаючых выяўляюцца сур'ёзныя адносіны да справаздач і праробленай працы. Праца крытыкуецца здаровай крытыкай, даюцца практычныя ўказаньні ў далейшай працы.

Селянін в. Дукоры Мазоўка Гарасім да справаздачы РВК уносіць шэраг практычных прапаноў і зьвяртае ўвагу [illegible] на неабходнасьць большага адпуску сродкаў па каштарысу на мерапрыемствы па падняцьцю сельскай гаспадаркі і пашырэньне сеткі сямігодак. Прапанова Ваўчэцкага аб вывучэньні пытаньня пабудовы электрастанцыі ў в. Дукоры атрымоўвае аднагалоснае адабрэньне і падтрыманьне ўсяго сходу.

Удзяляецца належная ўвага пытаньню калектывізацыі сельскай гаспадаркі; напрыклад, селянін в. Харавіч Прохарчык Кірыл, гаворачы пра чарговыя задачы, з натхненьнем закахаўшагася юнака, заклікае беднату аб'яднацца ў калектывы.

Усюды падкрэсьліваюцца галоўныя недахопы працы сельсавету—адсутнасьць кіраўніцтва працай устаноў і арганізацый, непрыцягненьне да працы актыву, недастатковую працу па падняцьцю сельскай гаспадаркі, палепшаньню дабрабыту, слабую працу з групамі беднаты і інш.

З выступленьняў сялян заўважваецца, што настаўніцтва Дукорскай сямігодкі ня прымае дастатковага ўдзелу ў грамадзкай працы.

Настроі беднаты і серадняков добрыя. Ёсьць упэўненасьць, што перавыбары пройдуць добра.

На сход зьяўляюцца ня ўсе выбаршчыкі, слабая яўка моладзі і яшчэ горш з яўкай жанчын. Прыкмячаецца, што з боку камсамолу няма належнай увагі гэтай кампаніі.

Кратовіч.

Кулацкі „Агітпроп“ заработай.

(Пагост Горспля, Расонскага раёну, Полацк ае акругі).

У пачатку справаздачнай кампаніі ў Сяляўшчынскім сельсавеце Расонскага раёну адбыўся сход царкоўнага актыву ў ліку 30 асоб пад кіраўніцтвам тройкі: былога статскага саветніка Лісова, папа Гедройца і заможніка Аляксеева. На кватэры папа за чаркаю гарэлкі абгаварваліся «царкоўныя» пытаньні і інш. Пасьля абгаварэньня былі дадзены кожнаму ўдзельніку заданьні.

Поп Гедройц пайшоў у атаку на Лазараўскі с. г. калектыў, які існуе на зямлі былога саветніка Лісова і аб'ядноўвае 7 гаспадарак. Аб'ектам апрацоўкі поп абраў грам. Дубініна Лявона—удзельніка калектыву. Пачынаецца гутарка папа такога зьместу: «Лявон! ведаю цябе як добрага чалавека. Ведае цябе і тваю сям'ю ўся мая парахвія. Ты чалавек ужо стары і на старасьці гадоў папаў з нажытым табою дабром у калектыў. Зьвязі ўсё сваё дабро ў нашае возера і затапі яго, так хоць будзеш бачыць, як тваё дабро топіцца, а ў калектыве яно ўтопіцца і бачыць ня будзеш». Доўга думаў Лявон, хадзіў сумны, еў мала і спаткаўшыся другі раз з попам парашыў выйсьці з калектыву. Прайшло некалькі дзён і грам. Лявон ізноў зьявіўся з заявай уступіць у калектыў, а пасьля спаткаўшыся з кімсь з актыву царкоўнікаў ізноў пакінуў калектыў.

Праца, якую вёў у стары час былы статскі саветнік Лісоў, вядома наваколічнаму насельніцтву. Аб высокім рангу і яго сіле можа сьведчыць наступнае: у сьвяточныя дні 2-3 разы ў год у вёсцы Пагост зьбіраецца земскі начальнік, прыстаў з гарадавымі, стражнікамі і іншымі трутнямі. На гэтае сьвята з Ленінграду прыяжджаў Лісоў і прыймаў парад пры царкве, а земскі начальнік сустракаў яго камандаю «смірна». Цікава, чаму гэтая кантоўнасьць, актывізуючаяся ў сучасны момант, ня выселена да гэтага часу.

М. і Б.

Праверка паказала шмат недахопаў.

(*Магілеўшчына*).

Магілеўскі акрвыканком паслаў на раёны 9 адказных працаўнікоў для праверкі ходу кампаніі па перавыбарах у саветы.

Да 20 лістапада скончана праверка 8 раёнаў (Шклоўскі, Бялыніцкі, Лупалаўскі і інш.), прычым некаторыя з іх, дзе больш кепска праводзілася праца, правераны 2 разы (Магілеўскі і Шклоўскі).

Трэба сказаць, што вопыт такой праверкі аказаўся жыцьцёвым і даў вельмі добрыя вынікі ў сэнсе ўяўленьня становішча падрыхтоўчае працы на мясцох у тым сэнсе, што праверка значна падштурхнула працу па падрыхтоўцы да перавыбараў на мясцох.

Прадстаўнікамі выяўлена, што меўся цэлы шэраг парушэньняў інструкцыі аб перавыбарах. Напрыклад: Стара-Вадвянская выбарчая камісія, Шклоўскага раёну, членам камісіі вызначыла заможнага селяніна, які карыстаецца сталаю і сэзоннаю наёмнаю працаю, які пазбаўлен выбарчых правоў, а ў выбарчую камісію Высоцкага савету, гэтага раёну быў вызначаны ў члены камісіі старшыня царкоўнага савету. І па цэламу шэрагу іншых саветаў меліся такія самыя недарэчнасьці. Большасьць сельсаветаў Лупалаўскага раёну не ўвяла ў склад камісій прадстаўнікоў ад КСУ, саюзу працаўнікоў зямлі і лесу, КСМ і жанчын.

Быў і такі выпадак, што старшыня Шчэжарскага сельсавету Сьвістуноў пасьля зацьверджаньня пленумам савету складу камісіі, выкасаваў аднаго з сяброў і дапісаў свайго.

У гэтым раёне выяўлена, што праца па падрыхтоўцы зусім не вядзецца. Раёнам дапушчана поўная дэцэнтралізацыя. Раённая выбарчая камісія ня ведае дзе і ў якім вучастку што мяркуе рабіць сельская выбарчая камісія. Высьветлілася і тое, што раённая камісія ня ведае аб колькасьці выбарчых вучасткаў. У складаемай цяпер справаздачы паказана, што выбарчых вучасткаў па Лупалаўскаму раёну маецца 167, між тым, як іх аказалася пасьля праверкі толькі 155.

Разгортваньне працы да перавыбараў сярод батрацтва, беднаты, жанчын і растлумачэньне наогул насельніцтву значэньня перавыбараў ідзе зусім слаба, бо праца распачата ў большасьці саветаў позна.

А. С.

Сельсавецкае сьвята.

(Рудняскі с.-с. Расонскага р.).

Адбыўся сход у в. Балбечына Рудняскага сельсавету, на які зьявілася 69 проц. маючых права выбарчага голасу паслухаць справаздачу сельсавету. Пасьля 12 гадзін дню пачынаюць зьяжджацца вярхом на конях сяляне падобныя да партызан грамадзянскай вайны, у ліку якіх і жанчыны.

Едуць Захарчане, Атокцы, Прыхабцы ідуць Балбечынцы і прыпыняюцца у школе. Прыходзяць сяляне з іншых сельсаветаў, якія ня ведаюць у чым справа і пытаюць: «Што-ж гэта за сьвята тут сёньня і чаму гэта ў Балбечыне, а ня ў нас? Атрад якраз падобен да таго, які ехаў гнаць абшарнікаў у час грамадзянскай вайны і нават тыя-ж людзі ёсьць, але спакойна едуць і без зброі». Старшыня с.-с. тав. Шпыркоў сустракаючы іх кажа: „Так, так добра зрабілі, што прыехалі. Трэба цікавіцца працай абранага вамі сельсавету і дапамагаць у перабудове вёскі. Дружна пакажаце памылкі і дайце параду ў працы савету—падзякую“.

Бедната за пяць дзён да справаздачы зьбіралася і добра абгаварыла шмат пытаньняў, падрыхтавалася і заняла месца наперадзе ў школе, каб паслухаць справаздачу савету. Пачалася справаздача. Усе слухаюць і чакаюць каб выказацца. Пасьля заканчэньня справаздачы пачаліся спрэчкі.

— Што-ж казаць. Старшыня наш, сэкратар і некаторыя сябры с.-с. працавалі добра. Мірылі нас у час пачосу жніва і пераво раў, выпраўлялі прагоны, сьмярдзючы самагон праганялі, беднату пры самаабкладаньні падтрымлівалі і гаспадарчы стан вёскі паляпшалі.

Але ня ўсе, бо ёсьць і такія сябры с.-с., якія плацяць падатку 79 руб. і вядома разам з прыкавчыкамі спажывецкай каапэрацыі забываюць пра сьпісы беднаты. Гэта яны ўцягваюць у шэрагі беднаты і ў сьпісы сваіх людзей.

Такіх сяброў с.-с. нам непатрэбна. Машыны з крэдытнага таварыства трэба больш бедняце даваць, а то яны папалі і заможнікам...

Прычым тут улада. Пападзе ў с.-с. «79-рублёвік» (заможнік), як у нас, напрыклад, а пасьля разьбірайся. Патрэбна пры здавальненьні хлебам не забываць беднату.

Заможнікаў не абіраць у сельсаветы.

Мост і грэблю наладзіць. Школу падрамантаваць. Пра калодзежы і дымавыя трубы не забываць, а па выбарах усім зьявіцца, каб адсунуць тых, хто пра беднату забывае.

Полаччына. М.

Да перавыбараў падрыхтаваліся своечасова.

(Чавускі раён, Магілеўскай акругі).

Яшчэ 5 кастрычніка ўтворана раённая выбарчая камісія, якая склала плян працы па перавыбарах саветаў у раёне і да 1-га лістапада былі ўжо ўтвораны сельскія выбарчыя камісіі, якія вядуць падрыхтоўчую працу да перавыбараў. Складзены сьпісы выбаршчыкаў, а таксама складзены сьпісы пазбаўленых правоў голасу.

Вылучана 153 выбарчых вучасткаў, супроць 112 у мінулым годзе, з іх 3 вучасткі нацыянальныя, 2 польскія і 1 яўрэйскі. Выбарчыя вучасткі забясьпечаны адпаведнымі памяшканьнямі.

Растлумачальная праца сярод насельніцтва аб задачах перавыбараў распачалася з першых дзён кастрычніка: праз хаты-чытальні, пастаноўкі дакладаў на сходах і пленумах сельсаветаў, а таксама на пашыраным пленуме РВК быў пастаўлен даклад аб перавыбарах саветаў і справаздача аб працы прэзыдыуму РВК за мінулыя 2 гады.

Праведзены ў 15 сельсаветах канфэрэнцыі беднаты, дзе абмяркоўваліся пытаньні аб перавыбарах. На гэтых сходах удзельнічала 1344 беднякоў і 225 серадняков. Бедната актыўна ўдзельнічала ў абмеркаваньні гэтага пытаньня, а таксама завастрала ўвагу на гэту кампанію партыйных, камсамольскіх і прафэсыянальных арганізацый.

Зараз сельсаветы склалі свае справаздачы аб праробленай за 2 гады працы і пачынаюць даваць справаздачы перад выбаршчыкамі. Надыходзячыя перавыбары яшчэ больш патрабуюць падрыхтоўкі, каб даць належны адпор і перамагчы падрыхтоўку кулацкай часткі вёскі, бо ёсьць выпадкі, калі кулакі падпольна праводзяць свае сходы, на якіх разьмяркоўваюць паміж сабой абавязкі будучага с-с. Гэта трэба мець на ўвазе, асабліва бедняце.

В. Рабцаў.

Бедната адбіла наступ кулакоў.

(Тродавіцкі сельсавет, Расонскага раёну, Полаччына).

Адбыўся сход беднаты ў Тродавічах, на які раней беднякоў пазьбіраліся заможнікі і занялі месца на лаўках. Пры пачатку абгаварэньня пытаньняў, рашуча і арганізавана ў ход абгаварэньня ўмяшаліся заможныя і кулакі з крыкам: «Вы няньчыцеся з беднатою, чаму ўсім пайшчыкам хлеба з каапэрацыі не даеце, чаму добрае скуры на боты няма. Усе мы бедныя, а калі ёсьць трошкі «лепшыя», та на што нас расколваць на беднякоў, серадняков і кулакоў. Усім пароўну даць».

Каб прыпыніць арганізаваны наскок на сход беднаты, кіраўнік сходу тав. Русак зьвярнуўся да крыкуноў з тлумачэньнем, што сход беднаты абгаварвае пытаньні, а вы, як госьці, трымайцеся са бе гасьцямі і не перашкаджайце.

Падняўся гоман пад кіраўніцтвам былога служачага РВК Іванова Янкі. «Вы бачыце, што робіцца, прадстаўнік і той выганяе нас сапраўдных працаўнікоў, сярод якіх ёсьць і маючыя права голасу, а іх гоняць з сельсавету. Давайце пакінем сход, бо і мы пайшчыкі, а яны гэтая бедната сабралася ўжо абгаварваць, каб прасунуць у сельсавет тых, хто зноў будзе даваць хлеб бедняце з каапэрацыі, а ня ўсім пайшчыкам».

Бедната дала рашучы адпор наскоку кулакоў.

—Нас беднякоў сёньня мала, бо дрэннае надвор'е, а яны на конях. На выбарах ня пусьціць гарлапаніць супроць нашай бядняцкай улады і не праводзіць у сельсавет як іх, так і іх прыхільнікаў.

Б—віч.

Абгаварваем дасягненьні.

(Вёска Грыбава, Сяляўшчынскага сельсавету).

У пачатку сьнежня м-ца адбыўся сход сялян пад старшынствам сялянкі грамадзянкі, на які зьявілася 68 проц. грамадзян сельсавету.

Добра падрыхтаваўшы для зразуменьня сялян даклад с.-савету, сэкратар тав. Зайцаў рабіў даклад у працягу гадзіны. Усе ўважліва слухалі, асабліва месца дзе ўпаміналася: плошча пасеву ў нашым с.-с. у 1927 г. налічвалася на 239 дзесяцін, у 1928 г. яшчэ павялічана на 205 дзесяцін. Павялічыўся лік коняй, кароў, пасеў канюшыны з 15 дзес. 1926 г у 1927г. павялічыўся да 25 дз., а ў 1928г. да 87 дзесяцін. Кораньплодаў ў 1926 г, было пасеена 0,5 дзесяціны у 1927 г. 1 дзес. і ў 1928 г.—6 дзесяцін.

Арганізаваны на тэрыторыі с.-с. адзін калгас з 6 сямействамі, 2 машынных таварыства з 29 сяброў і ўступленьне ў камітэт сялянскае узаемадапамогі даведзена да 73 проц.

На тэрыторыі с.-с адрамантавана старых мастоў 97, пабудавана новых 48, падвезена пяску 280 куб. саж. Фашын укладзена 120 куб. саж., канаў абочных пракопана працягам 15 клм. Ад падатку асвабодзена бядняцкіх гаспадарак у 1927 г. 231, а ў 1928 г.—242. Дзяржава з сялян нашага савету бярэ падатку каля 4000 р., а дае ў нашыя гаспадаркі наступнае: лесу ў крэдыт на 500 руб., крэдыту на коняй на 2695 р., крэдыту на каровы 1200 р. і лесу дарэмна на 500 р. г. зн. уложана ў гаспадаркі Сяляўшчынскага с.-с. 5500 руб., акрамя страт на ўтрыманьне культурных устаноў і інш.

Адобрыўшы працу сельсавету і ўнёсшы дадаткі ў пастанову па дакладу, грамадзяне сходу пастанавілі **паслаць прывітаньне Чырвонай арміі і пагранатраду Полацкага гарнізону ў асобе якіх сяляне вітаюць усю Чырвоную армію.** Адначасова даручылі с.-савету паслаць прывітаньне ўсім чырвонаармейцам з тых вёсак, дзе адбылася справаздача с.-с., наступнага зьместу: **«Вітаем вас нашы аднасельчане-чырвонаармейцы і патрабуем каб вы вучыліся абараняць краіну саветаў і ўдзельнічаць у сацыялістычным будаўніцтве, а пасьля вучобы зьяўляйцеся ў нашыя вёскі для карыснай працы.**

Полаччына. М—ліч.

Там, дзе слаба падрыхтаваліся да перавыбараў

З тых матар'ялаў, якія зараз атрымліваюцца ў месц, відаць, што ня ўсюды належна падрыхтаваліся да перавыбараў, і ня ўсюды грамадзкія арганізацыі прымаюць удзел у падрыхтоўчай кампаніі. Так, у Полацкай акрузе к-ты сялянскай узаемадапамогі амаль ніякага ўдзелу ў падрыхтоўцы ня прымаюць. Ні акруга, ні раёны не зрабілі захадаў да належнага прыцягненьня камітэтаў да гэтай кампаніі і да своечасовага абмеркаваньня кандыдатур з беднаты.

Таксама слаба праводзіцца работа з беднатой у іншых мясцох. У Гомельскім р. работа з беднатою пачалася толькі са сьнежня, у Бярэзінскім р. сходы беднаты мяркуецца склікаць толькі прыблізна ў 62 проц. усіх селішчаў.

Ёсьць шмат недарэчнасьцяй пры складаньні сьпісаў. У Гомельскім раёне, напрыклад, пазбаўлены выбарчых правоў «неосновательные гайдамаки», «неосновательные торговцы», глуханямыя і асобы, якія прыцягваліся да судовай адказнасьці, але не пазбаўленыя выбарчых правоў.

У Маслакоўскім сельсавеце, Капыскага р., адноўлены ў выбарчых правах былы афіцэр, а ў Дураўскім с.-с. пазбаўлены выбарчых правоў асобы, толькі быўшыя пад судом.

У Аляксандраўскім с.-с. Гарадоцкага р., ня ўнесена ў сьпіс пазбаўленых выбарчых правоў сям'я папа, а ў Балецкім с.-с., таго-ж раёну—былы паліцэйскі.

У Межынскім раёне работа да гэтага часу яшчэ не разгарнулася. Раённая выбарчая камісія засядала толькі адзін раз да 30-га лістапада, кандыдаты не абмяркоўваюцца, сходы беднаты і дэлегатак праведзены не па ўсіх сельсаветах.

У Асіпавіцкім р. кулакі імкнуцца ачарніць тых работнікаў, якія добра правялі клясавую лінію ў сваёй працы.

Сельсавет патрабуе аднаўленьня.

Сход гр-н і пленум В.-Крушынаўскага сельсавету заслухаў даклад прэзыдыуму сельсавету. Робячы даклад, старшыня вельмі мала казаў аб арганізацыйнай працы сельсавету, казаў толькі колькі прызначана падатку і колькі выканана, колькі страхоўкі, самаабкладаньня, а як сельсавет выканаў той наказ, які далі яму абіральнікі ў мінулыя гады—ні слова не сказаў.

Восьм часу было зададзена некалькі дзесяткаў пытаньняў па ўсёй працы сельсавету, на якія старшыня з вялікай цяжкасьцю даў адказы, якія маюць агульны характар. Спрэчкі, якія вяліся доўгі час, высьветлілі ўсю працу сельсавету, якая накіравана была, галоўным чынам, на спагнаньне падаткаў і страхоўкі да тэрміну.

Выдача справак сялянству адбываецца з тыднёвай валакітай, сельсавет, каб выдаць спраўку, цягае селяніна за 3-4 вярсты па некалькі разоў і, урэшце, калі дасьць спраўку, дык яна нічога ня варта, яе ў РВК ня прымаюць за спраўку.

Сэкцыі пры сельсавеце лічацца на паперы, праўда, культурная і сэкцыя палепшаньня дабрабыту цягнулі сваё існаваньне, а рэшта памёрлі.

Партыйнага кіраўніцтва сельсавет ня мае, адгэтуль цэлы шэраг скрыўленьняў лініі партыі і савецкай улады; інструктар РВК ні разу за два гады не заглянуў, каб праверыць працу з пункту погляду правядзеньня клясавай лініі ва ўсёй працы сельсавету, час ад часу прыедзе прадстаўнік РВК, паглядзіць, што працуюць, ну і добра, а які склад сельсавету ці ён кулацкі, ці бядняцкі—ніхто ня ведае, бо з пратаколаў, якія адсылае сельсавет у РВК, вельмі цяжка судзіць аб працы сельсаветаў уцэлым.

Было, напрыклад, такое злачынства, што гр-ну, які можа плаціць падатак, сельсавет рабіў скідку 75 проц. як студэнту, а дакумэнту сельсавет ня мае, дык толькі сёлета рэвізійная камісія выявіла такі факт, што ён ня студэнт, а вучыцца ў Менску ў вячэрняй школе і адначасова працуе атрымліваючы звыш сотні рублёў, а сельсавет яго сям'ю яшчэ вызваляе на 75 проц.

Такімі пытаньнямі як арганізацыя калектыву, падвышэньне ўраджайнасьці прэзыдыум сельсавету ня цікавіўся, калі прыйдзецца даставіць вернаачышчальны абоз, дык і то з вялікімі патугамі, а вырашэньне такіх «дробязяй» як патравы, разборы спраў сялян зусім пастаўлены кепска, старшыня часта едзе сьведкай супроць бедняка і г. д.

У спрэчках адзначалася, што сельсавет патрабуе аднаўленьня, якое трэба зрабіць у часе надыходзячых перавыбараў сельсаветаў.

Я. Крушына.

В. Крушынаўскі сельсавет, Бабруйскае акругі.

Барацьба за саветы.

(*Ліст з Воршы*).

Дзесяткі выпадкаў падпалу кулакамі або іх «упаўнаважанымі» будынкаў вясковых актывістаў-грамадчыкаў, некалькі выпадкаў забойства сельсаветчыкаў і замахаў на забойства селькораў, тайныя сходы кулацтва,—гэта рэчаіснасьць, гэта сапраўднасьць, якая красамоўна гаворыць пра абвастрэньне клясавае барацьбы ў вёсцы. Паўтарацца ня трэба: аб гэтым досыць падрабязна пісалася ў «Савецкай Беларусі» з належнай палітычнай ацэнкай гэтых здарэньняў.

Задача гэтага артыкулу—высьветліць ход прадвыбарчай кампаніі на Аршаншчыне, паказаць хворыя і добрыя бакі працы сельсаветаў, выбарчых камісій і застанавіцца на групках сялянства, якія вядуць адну працу—барацьбу за саветы.

* * *

Першым чынам зьвернем увагу на добрую працу саветаў і выбарчых камісій.

У Круглянскім раёне ўзяты цьвёрды курс на вылучэньне жанчын-дэлегатак на актыўную савецкую працу. На кіраўнічую сельсавецкую працу мяркуецца абраць чатыры жанчыны. Ад кожнага сельсавету прымацаваны прадстаўнікі ад райвыканкому, якія будуць весьці ўсю кіраўнічую працу па перавыбарах, будуць выпраўляць на месцы магчымыя памылкі сельсаветаў. Выбарчыя вучасткі сёлета значна пашыраюцца.

У гэтым-жа [illegible] гараескі [illegible] арганізаваны два калгасы—«Ленінскі Луг» і «Ясная Паляна», павялічана насяўная плошча, праведзена ачыстка насеньня ў часе асеньняй пасяўной кампаніі. Усё гэта зроблена дзякуючы добрай працы старшыні сельсавету—батрака-камсамольца Строка.

Наогул, працу Круглянскага райвыканкому характарызуюць арганізаваныя калгасы, арцелі, таварыствы. Толькі сёлета арганізавана 7 новых калектыўных гаспадарак, 2 малочныя арцелі, 4 машынныя таварыствы, 7 садова-гародных т-ваў, 6 меліярацыйных і 1 гароднае т-ва. У часе справаздач райвыканкому ёсьць чым пахваліцца, бо наказ выбаршчыкаў выканан звыш. Але ўсё-такі гэта ня значыць, што ў раёне ўсё ціха, спакойна—недахопы ў працы былі і ёсьць, але аб іх пасьля.

Першая справаздача Сакалавіцкага сельсавету, Крупскага раёну была ў вёсцы Скакоўка На сходзе прысутнічала каля 70 чал. Выступаўшыя сяляне аднагалосна паўтаралі, што сельсавет наказ выканаў поўнасьцю. 35 проц. гаспадарак, вызваленых ад падатку, хуткі разгляд сялянскіх заяў і скарг, выжыцьцё бюракратызму і валакіты, правільнае скарыстаньне сродкаў ад самаабкладаньня (за 400 рублёў набудаваны 3 масты, 350 руб. пашло на ўзмацненьне пажарнае дружыны)—хіба гэта не гаворыць аб правільным клясавым падыходзе сельсавету да працы?

У Бобрскім сельсавеце, гэтага-ж раёну, асаблівая ўвага зварачваецца на тое, каб у сельсавет не пралезьлі кулакі, гандляры і шкодныя нашаму будаўніцтву элемэнты. Абіральнікі адзначаюць посьпехі ў працы сельсавету: пабудаваны масты і папраўлены шляхі за сродкі ад самаабкладаньня, адрамантавана памяшканьне больніцы, на што затрачана 640 руб., адпушчана 300 руб. на школьнае будаўніцтва. За 500 руб. 2 м-цы працавалі ў сельсавеце 2 дзіцячыя пляцоўкі. Як новае ў гэтым годзе (што, бязумоўна, павінны пераняць другія сельсаветы Беларусі) аказана дапамога вучням беднякоў са сродкаў самаабкладаньня, у суме 150 руб.

У г. Дуброўне праводзяцца сходы жанчын па пытаньнях падрыхтоўкі да перавыбараў саветаў. Праводзяцца сходы беднаты, дзе грунтоўна абгаварваюць працу гарсавету старога складу, абмяркоўваюцца кандыдатуры ў новы склад. Сябры саюзу, працуючыя ў гарсавеце, робяць справаздачы аб сваёй працы на сходах сяброў саюзу. Складзены сьпісы абіральнікаў, а таксама і сьпісы пазбаўленых выбарчых правоў

Праводзіцца праца па падрыхтоўцы да перавыбараў і з батракамі. Прыклад гэтаму дае Смальлянскі сельрабачком, які правёў па двух сельсаветах сходы батрацтва, дзе абмяркоўваліся кандыдатуры ў саветы.

Аб прыкладнай працы амаль што пара і скончыць.

* * *

Першая і галоўная стаўка кулака з мэтай пралезьці ў саветы—выбарчая камісія. Калі ў выбарчай камісіі будзе «свой чалавечак», то можна быць больш, чым упэўненым, што можна мець усе шансы пралезьці ў савет. Так у сапраўднасьці і робіцца.

У Пячонкаўскую выбарчую камісію пралез кулак—п'яніца Смаргуноў. У мінулым—старшыня малочнай арцелі, якую давёў да развалу. Ну, і што ж? Вы думаеце, што ў турме ён сядзеў? Памыляецеся... Пасьля гэтага ён быў сябром с.-с. вёскі Гроз, дзе заракамэндаваў сябе «кіраўніком і правадыром» беднаты над эксплёатацыю кулацтва. Чаму-ж ён карыстаецца такім аўтарытэтам? Усяму прычына—знаёмства ў райвыканкоме, ды к таму-ж брат яго—старшыня сельсавету. Будучы ў выбарчай камісіі, можна пралезьці самому ў савет, а калі гэта ня ўдасца—брата можна правесьці зноў старшынёй.

Смаргуноў—чалавек „з галавой“—з сярэдняй адукацыяй, а таму кулацтва даверыла яму абараняць свае інтарэсы. Бедната абурана: на кожным прадвыбарчым сходзе ўздымаецца хваля пратэстаў з боку беднаты супроць Смаргунова. Пакуль пажаданых вынікаў няма, бо сябры РВК няраз п'янствавалі з Смаргуновым. Патрабуецца ўмяшаньне акруговай выбарчай камісіі, каб выключыць са складу выбарчай камісіі кулака Смаргунова.

Нікуды няварты склад і Лядзянскай сельсавецкай выбарчай камісіі. У камісію абралі зусім не зацікаўленых перавыбарамі саветаў асоб, якія нават на пасяджэньні не зьяўляюцца. Райвыканком павінен перагледзець склад камісіі, праверыць працу і непрацаздольных выключыць з камісіі.

Заможнікі вёсак Сідрычына і Івашкава, Шапкаўскага сельсавету, Аршанскага раёну, узялі пад свой уплыў сяброў сельсавету, а таксама імкнуцца ўзяць пад сваё кіраўніцтва беднату і серадняцтва. Заможнік Ерміх С. праводзіць спэцыяльныя сялянскія сходы ў вёсцы Івашкава, дзе кожны раз ставіць на абгаварэньне сходу:—За што мяне пазбавілі выбарчых правоў? Якое яны мелі права? А 25 лістапада ў Юрдаўскай краме ён наладзіў цэлую папойку з сябрамі выбарчае камісіі, з сябрамі сельсавету і з сялянамі, якія больш-менш карыстаюцца аўтарытэтам сярод выбаршчыкаў.

Лясная камісія пры Стаінскім сельсавеце, Круглянскага раёну, абараняе інтарэсы кулацтва. Пры разьмеркаваньні лесу мясцовага значэньня яны выкінулі лёзунг:—усім трэба лес—як багатым, так і бедным! Толькі дзякуючы энэргічнай растлумачальнай працы старшыні сельсавету Шарапава бедната дала рашучы адпор імкненьням кулацкай камісіі.

Трэба спадзявацца, што бедната і ў часе перавыбараў дасьць рашучы адпор гэтым кулацкім падпявалам.

Сябра сельсавету вёскі Шупені, Круглянскага раёну ня толькі не вядзе культурнае працы, а нават перашкаджае гэтаму. Для нас яго тактыка зразумела: заможніку куды лепш „лавіць рыбу ў мутнай вадзе“. Калі прыяжджаюць з раёну прадстаўнікі з мэтай правесьці сход па якім-небудзь пытаньні, сябра с.-с. адказвае: «Ужо заказаў сход... Зараз усе прыдуць...» На самай жа справе ніколі не заказвае сходаў, і прадстаўнікі варочаюцца ў раён, не зрабіўшы ніякай працы.

Цэлымі месяцамі ляжаць не разгледжанымі заявы сялян у Мархлеўскім с.-с., Талочынскага раёну. Зараз такіх заяў ляжыць каля 200. Прыдзе селянін у сельсавет, здыме шапку, пакорна запытае:—Ну як, тав. Лісецкі, з маёй заявай?—Заўтра, заўтра будзем разглядаць...—адказвае старшыня.

А назаўтра—зноў заўтра... І так без канца.

Сабраныя сродкі ад самаабкладаньня, у суме 1500 руб., застаюцца нявыкарыстанымі.

Бываюць выпадкі, што грошы незаконна выкарыстоўваюцца, як гэта было ў вёсцы Царэўск. Пракапалі канаву ў сажняў 20—заплацілі 30 руб., у той час, калі праца каштуе ўсяго рублёў 15. Беднякі плацілі самаабкладаньне грашыма, а кулакі і заможнікі. як, напрыклад, Сярдзюкоў, адбывалі працай.

Саюз харчавікоў мястэчка Копысь нядбайна адносіцца да падрыхтоўкі да перавыбараў саветаў. Як прыклад нядбайнасьці, можна прывесьці зрыў сходу, на якім павінен быў быць даклад выбарчае камісіі. Слухаць даклад ніхто ня прышоў—нават старшыня саюзу Жук не зьявіўся на сход. Прычына зрыву сходу пасьля была высьветлена! Саюз не паведаміў рабочых...

Спажывецкія таварыствы Талачыншчыны і да гэтага часу чакаюць дырэктыў «з цэнтру» ад Дняпрасаюзу і Сельсаюзу. Што гэта азначае? Азначае тое, што людзі настолькі закапаліся ў паперах, што далей мёртвай літары нічога ня бачаць. Справа не ў дырэктывах, а ў жывой працы. Хай там людзі „акруговага маштабу“ з Дняпрасаюзу і Сельсаюзу выпрацоўваюць так званыя „дырэктывы“, а на мясцох спажывецкім і с.-г. таварыствам даўно неабходна было распачаць працу.

У Слаўнепскай парт'ячэйцы ёсьць настроі пашырыць выбарчыя вучасткі. Вядома, гэта няправільная тэндэнцыя, бо ад пашырэньня вучасткаў паменшыцца процант прысутнічаючых на перавыбарчых сходах.

На Кругляншчыне падрыхтоўка да перавыбараў у агульным, як азначалася вышэй, ідзе добра: праведзена 34 сходы беднаты; пытаньне аб перавыбарах стаяла на ўсіх пленумах с.-с., на нарадзе селькораў, але ўсё-такі маюцца выпадкі, што сельсаветы ня ставілі гэта пытаньне ў парадак дню. Загаранская і Цяцерынская парт'ячэйкі не правялі ніводнага сходу беднаты. Ёсьць выпадкі парушэньня інструкцыі: сьпісы абіральнікаў складаюцца габінэтным парадкам бяз удзелу сялянства. Палітасьветныя арганізацыі праводзяць зусім слабую працу ў справе падрыхтоўкі к перавыбарам.

* * *

Агульнае ўражаньне такое, што нашы савецкія нізавыя працаўнікі ня ставяць перавыбарчую кампанію, як нешта асаблівае, сур'ёзнае. Вядома, пра ўсіх гэтага нельга сказаць, але ў большасьці на перавыбары саветаў глядзяць, як на звычайную кампанію. Адсюль і несваечасовая падрыхтоўка, і безадказнасьць у працы, і запаўненьне складу выбарчых камісій кулацкімі элемэнтамі.

Больш сур'ёзна, з большай адказнасьцю аднесьціся да перавыбараў саветаў; правесьці склад выбарчых камісій; перайсьці ад габінэтных да жывых людзей—абіральнікаў; арганізаваць беднату; даць жорсткі адпор наступу кулацтва—вось задачы сёньняшняга дню ў справе перавыбараў саветаў на Аршаншчыне.

Цім. Зарэчны.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

пра зьняцьце з пасады рабочых і служачых, прынятых на работу з парушэньнем заканадаўства аб парадку найманьня рабочай сілы.

Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

Рабочыя і служачыя, прынятыя на работу з парушэньнем заканадаўства аб парадку найманьня рабочае сілы (прыняцьце на працу не праз біржу працы з парушэньнем калектыўнага дагавору, устаноўленьне судом альбо Рабоча-Сялянскай Інспэкцыяй факту пратэкцыянізму і г. д.), звальняюцца з пасады бяз выплаты выхаднае дапамогі на падставе пастановы акругавага інспэктара працы альбо акруговае Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **А. Дубавіцкі.**

7 сьнежня 1928 г.,
г. Менск.

Постановление

Совета Народных Комиссаров БССР

об увольнении с должности рабочих и служащих, принятых на работу с нарушением законодательства о порядке найма рабочей силы.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

Рабочие и служащие, принятые на работу с нарушением законодательства о порядке найма рабочей силы (прием на работу не через биржу труда с нарушением коллективного договора, установление судом или Рабоче-Крестьянской Инспекцией факта протекционизма и т. д.), увольняются от должности без выплаты выходного пособия на основании постановления окружного инспектора труда или окружной Рабоче-Крестьянской Инспекции.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР **Н. Голодед.**

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР **А. Дубовицкий.**

7 декабря 1928 года,
г. Минск.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену артыкулу 10 пастановы СНК „Аб зьменах у заканадаўстве БССР аб кааперацыі".

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе запісаць артыкул 10 пастановы СНК за 7 ліпеня 1927 году «аб зьменах у заканадаўстве БССР аб кааперацыі» (З. З. БССР 1927 г., № 32, арт. 164) у наступнай рэдакцыі:

„10 На падставе артыкулу 14 «Палажэньня аб кааперацыйным крэдыце» ўстанавіць, што агульны размер завінавачанасьці па гандлёвых і вытворчых апэрацыях, якія вынікаюць з задач збыту і забясьпечаньня, ня можа перавышаць: для крэдытных кааперацыйных арганізацый першай ступені пяціразовага, а для акруговых сельска-гаспадарчых крэдытных саюзаў—дзесяціразовага размеру спэцыяльнага капіталу, які вылучаецца згодна з арт. 14-м „Палажэньня аб кааперацыйным крэдыце".

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **А. Дубавіцкі.**

7 сьнежня 1928 году,
г. Менск.

Постановление

Совета Народных Комиссаров БССР

об изменении статьи 10 постановления СНК «об изменениях в законодательстве БССР о кооперации».

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет изложить статью 10 постановления СНК от 7 июля 1927 года «об изменениях в законодательстве БССР о кооперации» (С. З. БССР 1927 г., № 32, ст. 164) в следующей редакции:

«10 На основании статьи 14 «Положения о кооперативном кредите» установить, что общий размер задолженности по торговым и производственным операциям, вытекающим из задач сбыта и снабжения, не может превышать: для кредитных кооперативных организаций первой ступени пятикратного, а для окружных сельскохозяйственных кредитных союзов—десятикратного размера специального капитала, выделяемого согласно ст. 14 „Положения о кооперативном кредите".

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР **Н. Голодед.**

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР **А. Дубовицкий.**

7 декабря 1928 года,
г. Минск.

Пастанова

Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

аб складзе ільна-пяньковага камітэту пры Эканамічнай Нарадзе.

Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

назначыць старшынёю ільна-пяньковага Камітэту пры Эканамічнай Нарадзе т. Сасноўскага, А. М., і членамі камітэту ніжэй памянёных таварышоў: ад НКЗ—Шатэрніка, А. В. і Хоцкага, П. А., НК Гандлю—Кізіла, Л. І., Дзяржпляну—Бонч-Асмалоўскага, Р. А., Белсельсаюзу—Левіта, І. Л., Белкаапсаюзу—Хаскіна, Г. Б., Белсельбанку—Перэльмана, М. Ш., ВСНГ—Камаева, Е. А., Эпштэйна, М. Я., і НК Фінансаў—Майзэльса, П. Б.

Старшыня Эканамічнай Нарады БССР **М. Карклін.**

Сакратар Эканамічнае Нарады БССР **В. Крывіцкі.**

29 лістапада 1928 г.,
г. Менск.

Постановление

Экономического Совещания при Совете Народных Комиссаров БССР

о составе льно-пенькового комитета при Экономическом Совещании.

Экономическое Совещание при Совете Народных Комиссаров БССР постановляет:

назначить председателем льно-пенькового комитета при Экономическом Совещании т. Сосновского, А. М. и членами комитета нижепоименованных товарищей: от НКЗ—Шатерника, А. В. и Хоцкого, П. А., НКТорга—Кизиля, Л. И., Госплана—Бонч-Осмоловского, Р. А., Белсельсоюза—Левита, И. Л., Белкоопсоюза—Хаскина, Г. Б., Белсельбанка—Перельмана, М. Ш., ВСНХ—Камаева, Е. А., и Эпштэйна, М. Я., и НК Финансов—Майзельса, П. Б.

Председатель Экономического Совещания БССР **М. Карклин.**

Секретарь Экономического Совещания БССР **В. Кривицкий.**

29 ноября 1928 г.,
г. Минск.

Культурнае будаўніцтва на прагляд грамадзкасьці.

З 9 за 16 сьнежня Народны Камісарыят Асьветы адчыніў выстаўку (Савецкая, 52) па прагляду тыпавых праэктаў школьнага будаўніцтва. Выстаўка гэта зьявілася ў выніку абвешчанага НКА конкурсу на лепшую школу. Абвешчаны конкурс даў 92 праэкты, якія зараз і выстаўлююца на прагляд шырокай грамадзкасьці.

Спадчына мінулага школьнага будаўніцтва і наогул школьныя справы нам досыць добра вядомы. Аб ахапленьні школьнай сеткай дзяцей працоўных кажаць ня прыходзіцца. Што-ж датычыцца пакінутых школьных будынкаў нават спэцыяльнага прызначэньня, дык яны ні ў якой меры не адпавядаюць свайму прызначэньню ні ў санітарных, ні ў пэдагагічных адносінах а разам з гэтым не адпавядаюць і агульнаму напрамку школьнага выхаваньня ў умовах сацыялістычнага будаўніцтва. Адгэтуль зразумела, што прыкладнага ўзору для школьнага будаўніцтва ў нас няма. Між тым рост школьнае сеткі і водпуск на гэту справу дзяржаўных сродкаў з кожным годам павялічваецца.

Абвешчаны НКА конкурс на лепшы тып школы бязумоўна павінен даць належныя вынікі, бо вакол гэтага конкурсу, як і ў самую праграму, пакладзены асновы стварэньня савецкай школы, якая-б адпавядала сапраўдным умовам і напрамку сацыяльнага выхаваньня працоўных у здаровых санітарных умовах. Асноўная мэта конкурсу—даць належны тып школы ў нашы раёны і вёскі.

Хто мае тое ці іншае дачыненьне да школы, той добра ведае сучасныя хібы яе а таксама ведае, што трэба выправіць і дадаць да новага здаровага будаўніцтва школы. Практычныя заўвагі па выстаўленых праэктах вельмі пажаданы і будуць карысны для поўнай ацэнкі выстаўленых праэктаў і прэміраваньня лепшых.

У праглядзе выстаўкі ў першую чаргу павінны прыняць удзел настаўнікі, санітарныя, школьна-санітарныя дактары. і сябры школьных саветаў, якія больш за ўсё ведаюць адмоўныя бакі сучасных школ.

У аснову крытыкі павінны быць пакладзены наступныя моманты: выгодная і зручная плянiроўка школ для вядзеньня заняткаў, адпаведнае гігіенічнае абсталяваньне і яго размяшчэньне, выстарчальнасьць сьвету і паветра, правільная ў санітарных адносінах сыстэма зьбіраньня і выдаленьня нячыстот, адпаведнасьць школы працоўнаму і фізычнаму выхаваньню і г. д. Апрача гэтага, пры школах павышанага тыпу (сямігодках), якія абслугоўваюць вучняў з далёкіх вёсак, павінны быць пабудаваны гігіенічныя інтэрнаты з адпаведным абсталяваньнем.

Асабліва каштоўны заўвагі тых працаўнікоў, якія добра ведаюць нашу вясковую школу і быт вёскі.

Д-р З. Магілаўчык.

ТЭАТР—КІНО.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР

Серада, 12 сьнежня,

„НАД НЁМНАМ"

(ДЛЯ «ПРАЛЕТСТУДУ»).

Пачатак роўна а 8 гадзіне ўвечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». БАЯВІК СЭЗОНУ **„ЭЛІСО".** Пачатак 1-га сэансу а 7 гадзіне.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". З аўторка, 11 сьнежня **„ІЛОНА".** Звыш праграмы: 2-гі тыдзень гастроляў сатырыка С. ВРОНСКАГА.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З аўторка, 11 сьнежня **„ЖОНКА САБЕІДА".**

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». Гістарычны фільм **„КАНЕЦ ДЫНАСТЫІ РАМАНАВЫХ".** Звыш праграмы: культфільм «ВОЛХАЎБУД».

Галоўлітбел 302

ХРОНІКА.

Палепшанае насеньне ўцякае.

Пасяўной кампаніі 1929 году надаецца вялікае значэньне. Да яе своечасова пачалі рыхтавацца, каб беспярэбойна загатовіць насеньне і правесьці іншыя мерапрыемствы па паднящцю ўраджайнасьці.

Адным з такіх мерапрыемстваў зьяўляецца пашырэньне палепшанага насеньня.

Як вядома, палепшанае насеньне, галоўным чынам, сканцэнтравана ў нашых саўгасах. Здавалася-б, што адпаведныя ўстановы павінны цікавіцца, каб ніводнае каліва такога насеньня не прапала дарма, што ўсё сартавое і палепшанае насеньне павінна быць выкарыстана выключна толькі на насеньне.

У сувязі з гэтым прэзыдыум Менскага АВК пастанавіў утварыць спэцыяльны фонд палепшанага насеньня пры сельска-гаспадарчай кааперацыі. АВК узьняў хадайніцтва перад СНК, НКЗ і Эканамічнай Нарадай замацаваць палепшаны насенны матар'ял за саўгасамі, каб апошнія ня глумілі палепшанае насеньне.

СНК у сваім адказе ад 19-га кастрычніка адзначыў, што такія фонды павінны быць арганізаваны, што трэба захаваць для сяўбы палепшанае насеньне. Але што мы маем зараз у сапраўднасьці? Трэба канстатаваць, што ніхто нічога ня робіць да захаваньня сартавога палепшанага матар'ялу. Саўгасы распараджаюцца насеньнем, як ім хочацца, насеньне пачынаюць вывозіць тысячамі пудоў. Ні Белсельтрэст, ні Белсельсаюз ніхто палец аб палец ня ўдарыць, каб спыніць такія адносіны да справы пашырэньня палепшанага насеньня.

Мы маем такія весткі, калі з саўгасу Рудня, Чэрвенскага раёну вывезена за межы раёну 1000 пудоў палепшанага ячменю. Чэрвенскае крэдытнае сельска-гаспадарчае таварыства зусім слушна заяўляе, што падобны вываз з раёну яравой культуры пакідае раён у вясеньнюю сяўбу бяз жадных пэрспэктыў на загатоўку, бо, апрача саўгасаў, нідзе нельга будзе дастаць насеньне.

Трэба, каб Наркамзем ужыў самыя рашучыя меры па захаваньні ў саўгасах усяго пасяўнога матар'ялу, трэба неадкладна арганізаваць у самых саўгасах захаваньне ад страўліваньня аўсу і ячменю, заміняўшы гэтыя культуры мешанкай з памольнага збору.

Першы вясковы рабфак у Дукоры.

Наркамасьветы пастанавіў арганізаваць першы вясковы рабфак у м. Дукоры, Менскай акругі. Сёлета на рабфак будзе прынята 40 чалавек. На рабфак будуць прымацца выключна батракі, сельска-гаспадарчыя рабочыя і сяляне-бедняки.

Курс навучаньня ў дукорскім рабфаку ўстаноўлен пяцёхгадовы.

Прыём заяў ад жадаючых паступіць на рабфак скончыцца 25 сьнежня, а заняткі распачнуцца з 2-га студзеня 1929 году.

ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГАРСАВЕТУ.

13 і 14 сьнежня адбудзецца пленум Менскага гарадзкога савету. На пленуме будзе заслухана справаздача аб дзейнасьці гарсавету за ўвесь час яго працы.

На пленуме будзе арганізавана выстаўка па розных галінах працы гарсавету.

Дапамога вучням беднаты.

Сэкцыя народнае асьветы Менскага гарсавету разгледзела пытаньне аб дапамозе вучням беднаты Меншчыны. Пастаноўлена дапамагчы бяднейшым вучням абуткам, адзеньнем і харчаваньнем на агульную суму 10.000 руб. Палова гэтых сродкаў маркуецца сабраць у парадку грамадзкае ініцыятывы, а другую палову адпусьціў Гарадзкі савет.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ЗІМОВАГА СПАРТЫЎНАГА СЭЗОНУ.

Менскі Цэрабкоп пачаў рыхтавацца да зімовага спартыўнага сэзону.

Ужо закуплены лыжы «Ідэал» і «Муртома» у колькасьці 250 пар, якія павінны паступіць у продаж у бліжэйшыя дні. Апрача гэтага праўленьне ЦРК пастанавіла закупіць 100 пар лыж беларускай вытворчасьці.

У вайскова-спартыўным магазыне ўжо маюцца ў продажы канькі, трусікі, боксэрскія рукавіцы і інш.

ЛІКВІДАЦЫЯ ДЗІЦЯЧАЙ КАЛЁНІІ «БЛОНЬ».

У парадку рацыяналізацыі ліквідавана дзіцячая калёнія „Блонь" каля г. Барысава. Дзеці з гэтай калёніі пераводзяцца ў калёнію «Сёмкава», дзе магчыма арганізаваць лепшае абслугоўваньне і за значна меншыя сродкі.

ВЫРАБ НАВУЧАЛЬНЫХ ПРЫЛАДАЎ.

У вытворчых майстэрнях менскага інспэктарыяту народнае асьветы арганізуецца новы цэх па вырабу для школ розных навучальных прыладаў. На вытворчасьці будуць заняты выключна беспрытульныя дзеці.

АТРЫМАНЬНЕ ГОДНАСЬЦІ ЗУБНОГА ТЭХНІКА.

Жадаючы даць магчымасьць афармісваць правы асобам, якія практычна падрыхтаваліся да зубапратэзнай працы, але па тых ці іншых умовах не атрымаўшыя годнасьць тэхніка, Нар. Кам. Аховы Здароўя разам з Нар. Кам. Асьветы, пастанавілі ўтварыць пры Мэдфаку БДУ праверку ведаў на атрыманьне годнасьці зубатэхніка.

Да праверкі дапускаюцца асобы, маючыя ня меней 2-хгадовага практычнага стажу па зубапратэзнай тэхніцы.

Курсы загадчыкаў сталовак.

Белрабсэкцыя вырашыла арганізаваць у Менску Усебеларускія курсы для карасадрыхтоўкі загадчыкаў сталовак ЦРК. На ўтрыманьне курсаў адпушчана 2860 руб. На курсы будзе выклікана 29 чалавек.

Нар. Кам. Аховы Здароўя—да 10-цігодзьдзя агалашэньня БССР.

Да часу сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя агалашэньня БССР па акругах будуць праводзіцца даклады аб дасягненьнях па ахове здароўя за 10 год.

У лячэбных установах будзе палепшана харчаваньне для хворых.

Апрача гэтага, да часу сьвята выпускаецца часопіс «Мэдычная думка», прысьвечаная юбілею. У дні сьвяткаваньня адбудзецца ўрачыстае адчыненьне псыхіятрычнай клінікі.

Абсьледваньне працы жанчын на прадпрыёмствах.

Нар. Кам. Працы БССР у бліжэйшы час прыступае да дэтальнага абсьледваньня і вывучэньня працы жанчын на прадпрыёмствах.

Абсьледваньне будзе праводзіцца на Дубровенскай мануфактуры, запалкавых фабрыках у Гомельскай акрузе, віцебскай акулярнай фабрыцы, віцебскай швэйнай фабрыцы «Прафінтэрн» і інш.

Мэта абсьледваньня—выявіць магчымасьць далейшага павялічэньня працы жанчын на прадпрыёмствах, іх кваліфікацыю і шэраг момантаў па ахове працы жанчын.

Тысяча рублёў—мацеры забітага лясьніка.

Нядаўна ў Парыцкім лясьніцтве, Бабруйскае акругі быў забіт самагоншчыкамі лясьнік А. А. Булгак.

Апошні быў заст. ахаваны ў Дзяржстраху ад няшчасных выпадкаў.

Белдзяржстрах выплаціў мацеры забітага лясьніка страхавой узнагароды 1000 р.

Арганізацыя Інстытуту жанарганізатараў пры кааперацыі.

Праўленьне Белкаапсаюзу прыступіла да арганізацыі інстытуту жанарганізатараў пры спажывецкіх т-вах.

Гэтыя жанарганізатары будуць весьці працу па ўцягненьню батрачак, бядначак і серадняччак у пайшчыкі кааперацыі, а таксама будуць весьці працу па ўзмацненьню бытавой працы ў кааператывах.

Скуртавары для дробных арганізацый.

Заяўка Наркамгандлю БССР на скуртавары для шавецкіх арганізацый БССР на бягучы 1928-29 год задаволена Наркамгандлем Саюзу ў суме 3,981.000 руб. З гэтай колькасьці будзе адпушчана працкалектывам на 2.476.000 руб., інвалідная кааперацыя—на 330.000 руб., дробнай розьніцы прамысловасьці—на 400.000 руб. і г. д.

Загатоўка бульбы цэрабкопамі.

Па ўсёй сетцы рабочай кааперацыі пляны па загатоўцы бульбы выканаы ў сярэднім на 64 проц. Лепш стаіць справа з загатоўкай у Віцебску і Полацку, дзе пляны выканаы на 80-100 проц. Горш з загатоўкай бульбы ў Гомелі і Бабруйску, якія выканалі плян на 30-50 проц. Белрабсэкцыя дала дырэктывы цэрабкопам прыняць усе меры, каб загатоўчы плян па бульбе быў выкананы поўнасьцю.

Менскі дзень.

33.400 руб. на загатоўку палепшанага насеньня да вясеньняй пасеўнай кампаніі адпусьціў Гомельскай акрузе Белсельбанк.

100.000 руб. на ўзмацненьне савецкіх гаспадарак Белсельтрэсту адпусьціў Белсельбанк.

Дзьве дзіцячыя кансультацыі адчыняюцца да часу сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя агалашэньня БССР у вёсках Мазырскай і Віцебскай акругах.

Новым старшынёй Беларускага саматужна-прамысловага саюзу назначан былы намесьнік Нар. Кам. Гандлю БССР тав. Брыскін.

— Гурток кройкі і шыцьця арганізаваў Менскі ЦРК для жонак пайшчыкаў. Гуртком ахоплена 45 чал., заняткі праходзяць 2 разы ў тыдзень. Апрача практычных заняткаў у гуртку знаёмяць жанчын з кааперацыйнымі пытаньнямі.

Ахова мацярынства і младзенцтва.

Цэнтральная Дзіцячая Камісія пры ЦВК БССР адпускае на бягучы 1928-29 год на ахову мацярынства і младзенцтва 67.000 руб. На гэтыя сродкі будуць утрымлівацца 85 ясельных ложкаў у Менску для матак-адзіночак, 15—у Гомелі, 15—у Магілеве, 10—у Барысаве, 10—у Воршы і 5—у Бабруйску, а ўсяго 140 ясельных ложкаў для матак адзіночак. Апрача гэтага, адпушчана 8.000 руб. на выдачу 135 пайкоў маткам-адзіночкам і 4.000 руб. на летнюю ясельную кампанію. Адпушчаны таксама сродкі на аддачу 55 дзяцей на патранат (аддача на выхаваньне ў рабочыя і сялянскія сем'і).

Зьбіраем жалезны лом.

9 сьнежня ў Менску адбылася першая вылазка камсамольцаў у ліку звыш 600 чалавек для збору жалезнага лому. Абсьледвана 8 цэнтральных вуліц Менску. Вынікі падрабязна не пад'агулены, але вядома, што яны вялікія.

Фізкультура і спорт

Усебеларускі лыжны прабег.

У першых лічбах лютага арганізуецца Усебеларускі лыжны прабег. З акруговых цэнтраў фізкультурныя каманды ў ліку 5—7 чал. будуць накіроўвацца на лыжах у Менск. Некаторым камандам прыдзецца прайсьці да 300 кілёмэтраў.

Перавыбары бюро гурткоў фізкультуры.

Прэзыдыум Вышэйшага Савету Фізкультуры Беларусі запрапанаваў усім саветам фізкультуры распачаць падрыхтоўку да перавыбараў бюро гурткоў фізкультуры. Перавыбары бюро будуць праходзіць з 1-га студзеня па 25-га лютага. У час перавыбараў будзе праводзіцца праца па арганізацыі новых гурткоў фізкультуры.

Абсьледваньне фізкультурнай працы на Мазыршчыне.

Прэзыдыум ВСФКБ пастанавіў правесьці абсьледваньне становішча фізкультурнай працы ў Мазырскай акрузе.

З гэтай мэтай туды камандыруецца прадстаўнік ВСФКБ.

Удзел фізкультурнікаў у вайскова-лыжным прабегу.

У канцы лютага арганізуецца вайскова-лыжны прабег.

Беларускія фізкультурнікі прымуць таксама ўдзел у гэтым прабегу.

Здарэньні.

Затрыманы зладзеі.

Затрыманы два зладзеі Н. Арзамас і Галей Яшма, якімі былі ўкрадзены хатнія рэчы ў Елісеева і Бродкіна (Інтэрнацыянальная вул., № 13) і ў Столера (Інтэрнацыянальная, № 16).

Пакажоўшчына.

У суботу вечарам, у Доме інвалідаў, інвалід Д. Лузан у п'яным выглядзе распачаў бойку з інвалідам Казлоўскім. У часе бойкі Лузан нанёс нажом раны Казлоўскаму. Апошні ў цяжкім становішчы адпраўлен у больніцу.

Кандытэрская фабрыка павінна будавацца ў БССР.

(Гутарка з інжынэрам харчовай групы ВСНГБ т. Клячкіным).

У бягучым гаспадарчым годзе ВСНГБ распачне пабудову ў Менску кандытэрскай фабрыкі, пабудова і абсталяваньне якой будзе каштаваць 1.600.000 руб.

Фабрыка дасьць 3.500 тон прадукцыі ў год пры рабоце ў адну зьмену. У фабрыцы будзе чатыры аддзяленьні: карамельнае—зойме 38 проц., цукерачна-ірысавае—35 проц., пасьціла-мармаладзе—12 проц. і ў другую чаргу—бісквітнае—15 проц.

Праэкт з тэхналёгічнага і будаўнічага боку ўхвален Навукова-Тэхнічным Саветам ВСНГ СССР.

Пабудову фабрыкі мяркуецца скончыць у 1931-32 годзе. З гэтага часу на ёй пачне працаваць 446 рабочых; гэта ў значнай меры зьмягчыць беспрацоўе у БССР.

У сувязі з вялікім ростам попыту на кандытэрскія вырабы, які да канца 10-цігодзьдзя ўзрасьце да 1,8 кілёграма на чалавека, фабрыка будзе нагружана поўнасьцю, калі будзе працаваць нават у 3 зьмены.

Трэба адзначыць, што фабрыка дасьць значную колькасьць экспартнай прадукцыі (мармалад, пасьціла і інш.).

На пабудову фабрыкі асыгнавана на бягучы год 200.000 руб.

Цяпер некалькі слоў аб эканамічнай выгадзе пабудовы гэтай фабрыкі ў БССР.

Сыравіна (антонаўскія яблыкі) у БССР будуць каштаваць на 50 проц. таньней, чымся ў Маскве (у нас 8 к. кілёграм, а ў Маскве—16 кап.) Бульбяная патака ў нас ёсьць свая, маскоўскія-ж заводы павінны яе купляць у нас, а гатовую прадукцыю мы павінны прывозіць з Масквы. Такім чынам, дзяржава расходуе вялікія сродкі на транспарт сыравіны і вырабаў, чаго ня будзе, калі фабрыка пабудуецца ў Менску.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што ў БССР рабочая сіла каштуе таксама значна таньней, чымся у Маскве.

Усе эканамічныя прадпасылкі гавораць за тое, што кандытэрская фабрыка павінна будавацца ў БССР. Толькі пабудоваю яе ў Беларусі будзе дасягнута ўзмацненьне эканамічнае базы нашай прамысловасьці і сапраўдная рацыяналізацыя ў галіне прамысловасьці СССР.

С. Азерскі.

„Савецкая Беларусь" дапамагла

ЦЕГАНІНА СКОНЧАНА.

19-га кастрычніка г. г. у нашай газэце № 242 была зьмешчана заметка „Загрузьлі ў бюракратызьме". У заметцы прыводзіліся факты звыш 2-хгадовай цеганіны з земляўпарадкаваньнем Альшанскай с.-г. арцелі, Круплянскага р-ау, Аршаншчына.

Па праверцы з боку ЦКК НК РСІ зьмешчаныя факты пацьвердзіліся. Зараз арцель землеўпарадкавана і праэкт будзе зацьверджан не пазьней 20 сьнежня г. г. райзем-камісіяй.

Уся-ж цеганіна ўзьнікла з памылковай арцельлю з прычыны нядбайных адносін сакратара с.-с. гр. Ярмалаева, які зьняты з працы і справа аб ім перадана ў суд.

ШКОДНІКА—ПАД СУД.

Гэты шкоднік—„лясьнічы" Ляўданскі—вораг сялянскі, як аб ім пісалася ў нашай газэце № 128-6-VI г. г. (Ляўданскі будуе царквы). Бедняком сялян ён адсылаў за лесам за дзесяткі вёрст, а для пабудовы царквы не шкадаваў добрага лесу, які дарма і бліска даваў царкоўнаму савету, бо ён лічыў сябе за „начальніка" і казаў: «як хачу так і раблю». Пракуратура Менакругі ўжо накіравала справу ў акруговы суд з абвінавачаньнем Ляўданскага у злоўжываньні. Трэба толькі, каб ён атрымаў па заслугах за «свае справы».

СІМКІН ЗВОЛЬНЕН.

У газ. «С. Б.» № 186 ад 14 жніўня г. г. быў зьмешчан допіс „Пара разагнаць сваякоў", які прыстроіліся ў Леніскім спажывецкім т-ве, Горацкага р-ну.

Пракуратура Аршанскай акругі высьветліла, што гр. Сімкін заг. складу сапраўды зьяўляецца шваграм Фрэйдзіна—рахункавода спажывецкага т-ва. Гэты-ж Сімкін раней меў масларобку, а жонка займалася гандлем. У сучасны момант Сімкін з працы звольнен.

ЗА ЗЛАЧЫНСТВЫ ЗЬНЯТ З ПРАЦЫ.

У допісу «Брайкін на карку рабочых» зьмешч: у № 163 „С. Б." ад 17 ліпеня г. г. паведамлялася аб шэрагу злачынстваў заг. прак. кал-ву шорнікаў. НК РСІ паведамляе, што пры расьсьледваньні факты пацьвердзіліся. Брайкін зьняты з працы і прыняты меры да ўзмацненьня прафпрацы у майстэрні.

ДАКУМАНТЫ ВЫСЛАНЫ.

30 верасьня г. г. у газ. «С. Б.» № 225 быў зьмешчан допіс «Пяць месяцаў цягаюць справу», у якім прыводзіліся факты цеганіны ў адносінах да грам. С. Як паведамляе нас загадчык Менскага Акруговага Архіву, дакуманты гр-ну С. высланы, а затрымка адбылася з прычыны пераезду і ўпарадкаваньня архіву быўш. Барысаўскага АВК.

Ліст у рэдакцыю.

У газэце «Савецкая Беларусь» № 282 за 8-12 г. г. у артыкуле «Суд» сказана, што Кастусь Лягун і Пётра Ігумнаў зьяўляюцца артыстамі Дзяржаўнага Вандроўнага Тэатру. Дырэкцыя БДВТ гэтым паведамляе, што памянёных асоб ніколі на службе ў БДВТ не было і няма.

Дырэктар Дзяржаўнага Вандроўнага Тэатру ГАЛУБОК.

Паштовая скрынка.

Тав. Кульбацкаму В. і інш. аўтарам. Пры дасылцы кожнага допісу патрэбна выразна паказваць свой адрас і прозьвішча, у праціўлеглым выпадку допісы зьмяшчацца ня будуць і ніякіх адказаў па іх давацца ня будзе.

«Воку».—Допіс «Ёсьць падтрымка бюракратам»—бяз подпісу. Дашліце свой адрас і сапраўднае прозьвішча.

М. Процька.—„Чырвонармеец і перавыбары сельсаветаў" ня пойдзе. Напішыце лепш, што робіць у гэтай кампаніі чырвонаармейцы і камуністы-сельскі, а не пра тое, што яны павінны рабіць.

Бачылу. «Аб нячлевах саюзу»—накіравана ў менскую акр. РСІ.

Адамовічу «Інваліды успакойцеся» ня пойдзе.

Папраўкі.

У № 284 нашай газэты па недагляду карэктуры ўкраліся памылкі. У арт.—„Кантонская камуна" (11 абзац) надрукавана: „Падаўленьнем кантонскага паўстаньня скончылася гэраічнае змаганьне"..., а павінна быць—„на скончылася гэраічнае змаганьне"...

У арт. «Больш увагі с.-г. падатку» у апошнім абзацы надрукавана: „Мы заклікаем прыняць масавыя рэпрэсыўныя меры"., а павінна быць: Мы НЕ заклікаем прыняць"...

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня кіно «Знойны прыезд». Пачатак а 7 з пал. і 9 з пал. гадз. увеч.

Білеты для сябраў саюзу 20 к., для сябраў клюбу—15 кап.

ПЭДГАБІНЭТ.

Сёньня а 7 гадз. увечары адбудзецца сход сэкцыі палавога выхаваньня. Праца па падсэкцыях.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА.**

АДКРЫТА ПАДПІСКА

на 1929 год

НА ШТОДЗЁННУЮ ЦЭНТРАЛЬНУЮ БЕЛАРУСКУЮ ГАЗЭТУ

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ",

ОРГАН ЦВК БЕЛАРУСІ.

15 СТУДЗЕНЯ 1929 г.—РОЗЫГРЫШ ЛЁТАРЭІ.

БУДЗЕ РАЗЫГРАНА 50 КАШТОЎНЫХ РЭЧАЎ

Усе, што падпішуцца на 6 мес., атрымаюць / на 1 год., атрымаюць **бясплатна** 1 білет. / 3 білеты.

У лётарэі будуць удзельнічаць толькі індывідуальныя падпісчыкі.

ЛЁТАРЭЙНЫЯ БІЛЕТЫ ВЫСЫЛАЮЦЦА ПА АТРЫМАНЬНІ КВІТКА АБ ЗДАЧЫ ПАДПІСКІ.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА

ДА 10 ЧЫСЛА ПАДПІСНОГА МЕСЯЦА

Уся падпіска, якая паступіць пасьля 10 чысла, будзе пераносіцца на наступны падпісны месяц.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

на 1 месяц—90 кап., на 6 месяцаў—4 руб., на год—8 рублёў.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Кніжка дапрызыўнай падрыхтоўкі за № 149 Пушкоца І., выд. Барысаўскім ваенкаматам, кв. 230.

— Кааперац. кніжка № 2836 Кантаровіч П. М., выд. Барысаўскім ЦРК, кв. 230.

— Кааперац. кніжка № 2410 Гольдман М., выд. Барысаўскім ЦРК, кв. 230.

— Пасьведчаньне аб нягоднасьці да вайсковай службы, выд. Барысаўскім ваенкаматам на імя Савінскага А., кв. 230.

— Кааперац. кніжка № 45 Пасечнікава М. В., выд. Барысаўскім ЦРК, кв. 230.

— Сяброўскі білет хімікаў Лакуко М. А., выд. завкомам зав. Домбаль у П.-Барысаве, кв. 230.

— Лекавая кніжка Крол В. Н., выд. Барысаўскай страхкасай, кв. 230.

— Кааперац. кніжка Мадзьвецкай Е. Г., выд. Барысаўск. ЦРК, кв. 230.

— Асабовая карт. № 2234 Насінінкага Х. М., выд. Татарскім РВК Барабінскага акр., кв. 230.

— Кааперац. кніжка № 1139 Сьвёвіля Р., выд. Барысаўскім ЦРК, кв. 230.

— Сяброўская кніжка Урэцкага І. Б., выд. Мазырскім ЦРК, кв. 231.

— Мэтрычная выпісь аб нараджэньні Бандаронка М. І., выд. адзз. Загса пры Слабодзк. РВК, кв. 232.

— Лекавая кніжка Голада П. А., выд. Мазырскай акрстрахкасай, кв. 233.

— Сяброўская кніжка Бейлінай Ф. А., выд. Мазырскім ЦРК, кв. 234.

— Бальнічны лісток Шпігановіч Е. І., выд. Мазырск. акр. бальніцы, кв. 235.

— Кааперац. кніжка Зайцава В. К., выд. МЦРК, кв. 236.

— Біржавы талён Бейнасоа С. Б., выд. Біржай Працы, кв. 237.

— Білет за № 578 Скараходова А. Я., выд. Сталіскім саюзам саматужнікаў, кв. 238.

— Вайсковая кніжка № 1108 Крывапалава І. П., выд. Барысаўск. ваенкаматам, кв. 239.

— Вайсковая кніжка № 291 Камінскага І., выд. Зембінскім РВК., кв. 240.

— Асабовая кніжка Паловіка Я., выд. Валяціцкім РВК, кв. 241.

— Дагавор купчай прадажы будынкаў ад Нісона Пейсахава Гурэвіча, Аўсеям Якаўлевым Дамам, пасьведчаны Барысаўскай натарыяльнай к-рай 2-га кастрычніка 1928 г. па 1-й частцы актавага зборніка № 115 па рээстру за № 4|1634 Бама А. Я., кв. 242.

— Асабовая кніжка № 84 Вяжэвіча С. М., выд. Крайскім ВВК, кв. 243.

— Дапрызыўная кніжка № 352 Марута А. С., выд. Менакрваенкаматам, кв. 267.

— Вучнёўскі білет Куправова З. Н., выд. Менскім музтэхнікумам, кв. 268.

— Кааперац. кніжка Шубейка І. А., выд. МЦРК, кв. 269.

— Пашпарт Дукорскай Ф. Б., выд. Ленінградзкай міліц., кв. 270.

— Кааперац. кніжка Гэрбэта Г. Э., выд. МЦРК, кв. 271.

— З біржав. талёны Паўцініна Г. А., выд. менбіржай працы, кв. 272.

— Паявая кніжка за № 1115 Калячонка С. Н., выд. прыгароднае спаж. т-вам гор. Барысава, кв. 273.

— Вайсковы білет Клеменцьева М. А., выд. гарадоцкім РВК, кв. 274.

— Кааперац. кніжка Агурскага С. Х., выд., МЦРК, кв. 275.

— Вучотная карт. Альшанскага Н. З., выд. Аўручскім ваенкаматам, кв. 276.

— Кааперац. кніжка № 9019 Грудзінскай Галіны О. В., выд. МЦРК, кв. 277.

— Партбілет № 0485607. выд. Астроўскім укомам Пскоўск. губ. на імя Дабулевіча А. А., знайдзен. Лічыць маючы мод, кв. 282.